Ніва

ТЫДНЁВІК ГП БГКТ

№ 6 (885) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 11 ЛЮТАГА 1973 г. ЦАНА 60 гр.



Сельскагаспадарчая спулдзельчасць

Той установай, з якой гаспадар мае штодзённыя кантакты, з'яўляецца гмінная спулдзельня. Тут гаспадар з кожным годам усё больш прадае, усяго больш купляе. Ад вясковай спулдзельчасці ў значнай меры залежыць лепшая абслуга ўсёй сельскай гаспадаркі, а гэта ж, вядома, адно з важнейшых заданняў, пастаўленых VI з'ездам ПАРП.

Беластоцкая спулдзельчасць, згуртаваная ў Ваяводскім саюзе гмінных спулдзельняў (ВЗГС), у мінулым годзе выказалася добрымі вынікамі. Сведчыць аб гэтым, між іншым, факт, што беластоцкі ВЗГС атрымаў ганаровую грамату ЦК ПАРП і Прэзідыума ўрада за выдатныя дасягненні ў галіне рэалізацыі абавязацельстваў для банку «20 мільярдаў». Трэба ведаць, што беластоцкая вясковая спулдзельня дала дадатковую прадукцыю, вартасць якой — 42 мільёны злотых.

Набліжаецца VI кангрэс ЦРС. Аб дасягненнях і далейшых планах, з якімі прыходзіць беластоцкі ВЗГС на кангрэс, мы папрасілі выказацца інж. Багуслава Глёрчыка — прэзаса праўлення ВЗГС.

— У мінулым годзе ВЗГС апрацаваў праграму паляпшэння абслугі сельскай гаспадаркі. У праграме гэтай адлюстраваны былі такія справы, як адпаведнае забеспячэнне мінеральнымі ўгнаеннямі, сельскагаспадарчымі прыладамі, спажывецкімі таварамі, адпаведная падрыхтоўка сельскіх пунктаў скупкі, далейшая разбудова баз. Як вы ацэньваеце выкананне гэтых задач?

— Выкананне намечанай намі праграмы праходзіла вельмі добра. Гадавы план мы перавыканалі. План рознічнага продажу за 1972 год выкананы на суму больш 6 мільярдаў зл., гэта значыць, на 18 прац. больш, чым у папярэднім годзе. Некаторых тавараў аднак не хапала. Перш за ўсё датычыць гэта цэменту, трактараў, парнікаў, малацілак, снопавязалак і інш.

Лепш праходзіла скупка свіней і быдла, значна палепшылася забеспячэнне рынку бульбай, палепшылася забеспячэнне нашых крамаў, асабліва ў час палявых работ і турыстычнага руху. Вартасць купленых ад гаспадароў тавараў ацэньваецца на 4,5 мільярда зл., гэта значыць, на 700 мільёнаў больш, чым у 1971 годзе.

Калі мы ўжо пры падліках, дык нельга не сказаць, што наша спулдзельчасць выканала паслуг амаль на 36 мільёнаў злотых. А да мінулага года мы не надавалі вялікага значэння гэтай галіне дзейнасці.

— Гэты дынамічны рост скупкі, забеспячэння таварамі, павелічэнне прадукцыі і паслуг выклікаў новыя інвестыцыйныя патрэбы.

— У мінулым годзе на інвестыцыі мы выдаткавалі каля 262 мільёнаў зл. І зноў для больш поўнай інфармацыі дадам, што гэта на 52 мільёны больш, чым у 1971 годзе. У выніку гэтага мы атрымалі шэраг новых аб'ектаў, напрыклад, 3 пякарні, 2 рамонтныя станцыі аўтамабіляў, рэстаран, 3 цэнтры здароўя, гандлёвы дом, маразільню фруктаў і гародніны і інш.

— Паколькі мы пры інвестыцыях, то ці не захацелі б вы сказаць некалькі слоў аб планах на 1973 год?

— Калі ласка, з прыемнасцю. У гэтым годзе мы аддамо 26 аб'ектаў, якія распачалі мы будаваць у папярэдніх гадах. Будуць гэта новыя пякарні, каўбасныя, склады, рэстараны і іншыя. Апрача таго, у гэтым годзе распачнецца пабудова наступных 48 аб'ектаў. У тым ліку будзе 12 механізаваных збожжавых складаў, цыкл пабудовы якіх не даўжэйшы аднаго года. Усяго на інвестыцыі ў 1973 годзе запланавана выдаткаваць 299 мільёнаў зл.

— Мы ўвесь час гаварылі аб новых складах, пунктах скупкі, каўбасных ды пякарнях. Але не найлепш справа выглядае з вясковымі крамамі, а асабліва з ПСП. Ці ў гэтай галіне можна чакаць нечага цікавага?

— Гэта праўда, што гэтыя 1000 ПСП — кепская візітная картачка нашага гандлю. Хочам ужо ад гэтага года пачаць будаваць новыя складаныя павільёны для патрэб ПСП. У гэтым годзе пабудуем іх 100. А ў наступных будзем павялічваць іх колькасць. Будову і ма-



дэрнізацыю нашых крамаў на вёсцы плануем закончыць у 1980 годзе. Нашы рамонтна-будаўнічыя брыгады перш за ўсё будуць будаваць аб'екты, звязаныя з сельскагаспадарчай прадукцыяй. Іх мы хочам закончыць да 1980 года. А пасля гэтага ўсе нашы будаўнічыя сілы мы плануем перакінуць на будову і мадэрнізацыю крамаў.

— Таварыш прэзас, створаны гміны, што на гэта спулдзельчасць?

— Мы з'яўляемся ўстановай, неабходнай для адпаведнага функцыянiравання гміны. Каб дапасавацца да новага адміністрацыйнага падзелу, мы вырашылі стварыць філіялы ГС там, дзе спулдзельня дзейнічае на тэрыторыі двух або трох гмін. У нашых умовах 36 гмінных спулдзельняў будзе мець 51 філіял.

— А што можна агульна сказаць пра сёлетнія планы?

— Што напэўна яны смелыя і што, каб іх выканаць, трэба будзе яшчэ лепш арганізаваць працу і больш рацыянальна выкарыстоўваць усе сродкі. Выканалі мы нялёгкія мінулагоднія заданні. Думаю, што выканаем і сёлетнія, тым больш, што мабілізуюць да гэтага цэнтральныя дажынкі, арганізаваныя ў Беластоку, і наш VI кангрэс ЦРС.

Размаўляў А. Карпюк
фота аўтара

Фатаграфія — выхаваўчы сродак

Звычайна фатаграфаванне трактуецца як чыё-небудзь хобі ў вольны ад працы час або проста прафесіянальны занятак. Дырэктар васьмікласнай школы ў Крыўцы, Гайнаўскага павету Міхал Зубрыцкі на сваім вялікім ужо настаўніцкім вопыце пераканаўся, што фатаграфія ў школе можа стаць адным з дасканалых пазнавальных і выхаваўчых сродкаў. Бо пакуль атрымаецца прыгожанькі здымак, фатограф павінен прайсці працавіты шлях грунтоўнага азнаямлення з правамі оптыкі, пазнаць таямніцы шэрагу хімічных працэсаў, навучыцца спраўна карыстацца апаратам, патрапіць улавіць найбольш вартасны вобраз. І ўсё гэта патрабуе грунтоўных ведаў па фізіцы і хіміі, працавітасці і вытрымкі.

Працяг на стар. 4



Крывецкія фоталюбіцелі на «паляванні».

БГКТ хроніка

■ 23 студзеня памёр Пётр Стасевіч, які ў гадах 1963—1966 быў актыўным членам рэвізійнай камісіі гарадскога аддзела БГКТ у Беластоку. Пётр Стасевіч быў узнагароджан Кавалерскім крыжам Ордэна адраджэння Польшчы.

■ 26 студзеня сабралася на першае сваё пасяджэнне Галоўная рэвізійная камісія ГП БГКТ сёмай кадэнцыі з удзелам намесніка старшыні ГП, галоўнага рэдактара «Нівы» Георгія Валкавыцкага. Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі ролю і задачы Галоўнай рэвізійнай камісіі і камісій у аддзелах БГКТ, якія не заўсёды стаяць на вышыні сваіх статутовых абавязкаў. Пастаноўлена ў другой палавіне лютага арганізаваць нараду старшынь рэвізійных камісій аддзелаў, аказваць ім значна большую дапамогу і каардынаваць іх працу. Затым старшыня Галоўнай рэвізійнай камісіі Міхась Хмялеўскі прадставіў праект «Рэгуляміну» гэтых камісій і праект плана працы да канца 1973 года. Пасля іх абмяркоўкі гэтыя два дакументы былі прыняты ўдзельнікамі нарады. На гэтым пасяджэнні Галоўная рэвізійная камісія разгледзела таксама рэалізацыю бюджэту ГП за 1972 год.

■ 28 студзеня ў памяшканні Галоўнага праўлення ў Беластоку адбыўся конкурс беларускай песні Беластоцкага павету. Адкрыў яго старшыня павятовага праўлення аддзела Янка Цялушэцкі. Удзельнікі конкурсу выконвалі па дзве беларускія песні. У партыі салістаў выступілі: Надзея Дудзік і Ніна Мушынская з Гарадка, Жэня Грыка з Юшкавага Груда, Люба Лукашэвіч і Надзея Ярмоліч з Пянькоў, Хведар Садоўскі з Васількова, Януш Астапчук з Міхалова. Першае месца журы прызнала Ніне Палоцкай з Кабылянкі, другое Аляксандры Лукшы з Міхалова, трэцяе Зофіі Цэцэрка з Баброўнікаў.

Дуэты складаліся з наступных асоб: Любы Саковіч і Кастуся Галубоўскага (спяваў бацька з дачкою; ён з Луплянкі, яна з Юшкавага Груда), Любы Лукашэвіч і Жэні Мартэнчык з Пянькоў і Зофіі і Міхася Цэцэркаў (муж і жонка) з Баброўнікаў. Першае месца здабылі — Вольга і Галіна Госцікі (маці з дачкою) з Міхалова і два другія месцы — Ніна Мушынская і Надзя Парэмбская, а таксама Ніна Цыванюк і Ірэна Паўлючук.


Вакальны калектыў з Пянькоў выступіў у наступным складзе: Надзя Ярмоліч, Надзя Астравецкая, Яўгенія Парэмбская, Люба Лукашэвіч, Яўгенія Мартэньчык і Ірэна Ваўранюк. У склад вакальнага калектыву з Гарадка ўваходзілі: Ніна Мушынская і Ніна Цыванюк, Ірэна Кардаш, Галіна Жукоўская, Ірэна Паўлючук і Надзея Парэмбская. Гэтаму калектыву было прызнана першае месца. Другое месца заняў вакальны калектыў з Новай Волі; гэта: Анна Грыка, Анна Кузьміцкая, Раіса Буйко, Клаўдзія Домань і Марыся Сак. Удзельнікам конкурсу з Гарадка акампаніяваў Сцяпан Копа, а з Міхалова — Іяланта Бычык. Узнагароды былі ад Галоўнага праўлення БГКТ, павятовага праўлення сельскагаспадарчых гурткоў, аддзела культуры ПРН і павятовага праўлення добраахвотных пажарных каманд. Узнагароды ўручыў старшыня павятовай рады нарадовай у Беластоку Базыль Гулько, які таксама перадаў шчырую падзяку ўсім удзельнікам конкурсу. Вёў конкурс старшы інструктар ГП Янка Крупа.

■ 27 студзеня гарадскі аддзел БГКТ у Беластоку арганізаваў вечар для пенсіянераў, на якім старшыня гэтага аддзела Мікалай Гайдук выступіў з дакладам аб дасягненнях эканомікі і культуры Беларускай ССР.

■ Варшаўскі аддзел БГКТ аднавіў ранейшую традыцыю арганізавання літаратурных пятніц. 26 студзеня старшыня аддзела Аляксандр Баршчэўскі расказаў прысутным аб жыцці і творчасці вядомага беларускага пісьменніка Янкі Купалы і адказваў на шматлікія пытанні. Затым Ганя Туронак дасканала дэкламавала верш Янкі Купалы «Алеся», а Віктар Швед прачытаў свой верш «Янку Купалу». (мх)

© PDF: Kamunikat.org 2023 © PDF: Kamunikat.org 2023

◊ Падзеі ◊ Здарэнні ◊ Факты ◊ Каментарыі ◊ Весткі ◊



СВЕТ

ПЕРШЫЯ МІРНЫЯ ДНІ

У Ханой прыйшлі дні мірнай працы. Вуліцы і плошчы сталіцы ўпрыгожаны сцягамі, транспарантамі і маляўнічымі плакатамі, якія сімвалізуюць мужнасць, гераізм, перамогу народа ў барацьбе за свабоду і незалежнасць сваёй радзімы. У гонар перамогі ва ўсіх гарадах і населеных пунктах на працягу 8 дзён былі вывешаны нацыянальныя флагі.

З вялікім натхненнем сустрэў увесь в'етнамскі народ зварот ЦК Партыі працоўных В'етнама і ўрада ДРВ, у якім былі намечаны новыя задачы па аднаўленню разбуранай вайной народнай гаспадаркі краіны.

Вестка аб аднаўленні міру выклікала вялікі працоўны ўздым па ўсёй краіне. Напружаная праца кіпіць у ханойскім рачным порце, да вугальных кар'ераў Хангая сцягваюцца экскаватары, бульдозеры і іншыя машыны, выведзеныя адтуль на час бамбардзіровак, па дарогах, якія вядуць у Ханой, рухаюцца аўтамашыны, гружаныя абсталяваннем для прадпрыемстваў і ўстаноў, эвакуіраваных раней у сельскія раёны.

НАД ПРАБЛЕМАМІ БАРАЦЬБЫ З ЗАСУХАЙ

Праблемы барацьбы з засухай і забеспячэння далейшага росту сельскагаспадарчай вытворчасці вынесены на абмеркаванне аб'яднанай сесіі Акадэміі навук СССР і Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук СССР.

КАНСУЛЬТАЦЫЯ Ў ВЕНЕ

У Вене адбываюцца падрыхтоўчыя кансультацыі прадстаўнікоў еўрапейскіх краін, ЗША і Канады па арганізацыі перагавораў аб узаемным скарачэнні ўзброеных сіл і ўзбраенняў у Еўропе.

СЕСІЯ САВЕТА АБАРОНЫ

У Каіры закончылася надзвычайная сесія савета сумеснай абароны арабскіх дзяржаў, у якой прымалі ўдзел міністры замежных спраў і абароны, а таксама дэлегацыя палесцінскага руху супраціўлення.

На сесіі прынята шэраг важных рашэнняў адносна аб'яднання намаганняў і каардынацыі дзеянняў арабскіх краін у іх барацьбе супраць ізраільскай агрэсіі. Савет назначыў ваеннага міністра АРЕ генерала Ахмеда Ісмаіла Алі галоўнакамандуючым паўднёвым (Егіпет), паўночным (Сірыя) і ўсходнім (Іярданія) франтамі.

ПАВЫШЭННЕ ЦЭН У ДАНІІ

Урад Даніі аб'явіў аб павышэнні з 1 лютага гэтага года цэн на наступныя прадукты харчавання: на малако — на 20 працэнтаў, на масла — на 15, на сыр — на 25, на хлеб — на 20, на цукар — на 30 працэнтаў.

ЗВАЛЬНЕННІ

Амерыканскія манаполі ў пагоні за звышпрыбыткамі праводзяць кампанію масавых звальненняў працоўных. Так «Нью Йорк тэлефон компані» ў 1972 годзе звольніла каля 8 тыс. рабочых і аб'явіла аб наступным звальненні яшчэ 5 тысяч чалавек. Канцэрн «Галф ойл карпарэйшн» звольніў каля 2 тыс. чалавек, кампанія «Сентрал рэйлдроуд оф Нью-Джэрсі» за апошнія два месяцы звольніла 400 рабочых. (ак)



БССР

ВЫНІКІ 1972 ГОДА

Цэнтральнае статыстычнае ўпраўленне аб'явіла вынікі змаганняў працоўных Беларусі за выкананне планавых заданняў 1972 года. Гадавы план прадукцыі прамысловыя прадпрыемствы БССР выканалі на 101,6 працэнта. Прырост прамысловай вытворчасці ў параўнанні з папярэднім годам склаў 9,7 працэнта. Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці ўзрасла за год на 6,3 працэнта. Нацыянальны даход павялічыўся на 8 працэнтаў.

З паведамлення ЦСУ вынікае, што ўсе галіны нацыянальнай гаспадаркі БССР паспяхова закончылі мінулы год.

У КАЛГАСЕ «РАСІЯ»

Калгас «Расія» Дзятлаўскага раёна за добрыя прадукцыйныя вынікі быў удастоены Юбілейнага ганаровага знака ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР і ВЦСПС. Калектыў калгаса ў адказ рашыў яшчэ болей павысіць свой ураджай. Калгаснікі з «Расіі» ў 1973 годзе спадзяюцца атрымаць з кожнага гектара не менш чым 30 цэнтнераў збожжа.

АРШАНСКІЯ СТАНКІ

Складаныя станкі для апрацоўкі металу, якія выпускае аршанскі завод, знайшлі шырокае прызнанне ў спецыялістаў. Іх прадаюць у 57 краін свету. Асабліва адзначаюцца бездакорнай працай станкі з праграмным кіраваннем. За апошнія гады завод амаль падвоіў сваю прадукцыю.

ПРА МІНУЛАЕ БЕЛАРУСІ

Беларускія вучоныя-гісторыкі рыхтуюць калектыўнае даследаванне па гісторыі Беларусі. Яно разлічана на 5 тамоў. Першы том гэтай «Гісторыі Беларускай ССР» ужо паявіўся. Яго апрацавала рэдакцыйная калегія пад кіраўніцтвам К. І. Шабуні, а надрукавала Мінскае выдавецтва «Навука і тэхніка».

У гэтым томе даецца распрацоўка першабытнага ладу і эпохі феадалізму на тэрыторыі Беларусі. Знаходзім тут новае асвятленне, абаснаванае на багатым архіўным матэрыяле, праблем фарміравання беларускай нацыі і антыфеадальнай класавай барацьбы працоўных Беларусі. Аўтары тома часта закранаюць гісторыю Польшчы. Таму «Гісторыя Беларускай ССР» павінна зацікавіць польскіх даследчыкаў нашага супольнага мінулага.

«ТРЫБУНАЛ» А. МАКАЁНКА Ў МАСКВЕ

Няспынным поспехам масквічоў карыстаецца камедыя «Трыбунал», аўтарам якога з'яўляецца сучасны беларускі драматург Андрэй Макаёнак. Яе ставіць Маскоўскі драматычны тэатр з Малой Броннай.

Нядаўна гэты тэатр запрасіў на гасцінныя гастролі двое беларускіх акцёраў — Г. Макараву і Г. Аўсяннікава, якія ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы ў Мінску выконваюць галоўныя ролі — Паўліны і Цярэшкі — Макаёнкавай камедыі. Выступаючы супольна з маскоўскімі калегамі, мінскія артысты выконвалі свае ролі на беларускай мове. Гэта вельмі падабалася масквічам, якія беларускіх акцёраў адарылі кветкамі і добрым словам. (вр)



ПОЛЬШЧА

ПАСЯДЖЭННЕ ПАЛІТБЮРО

30 студзеня адбылося пасяджэнне Палітбюро, на якім абмяркоўвалася справаздача аб візіце польскай дэлегацыі на чале з І сакратаром ЦК ПАРП Э. Геркам і старшынёю Рады Міністраў П. Ярашэвічам у Чэхаславакію. Галоўнай тэмай праведзеных размоў, як вядома, былі справы супрацоўніцтва двух братніх партый і краін, а таксама магчымасці яго далейшага пашырэння.

У чарговым пункце пасяджэння Палітбюро знаёмілася з інфармацыяй міністра замежных спраў адносна сітуацыі ў В'етнаме пасля заключэння дагавору аб заканчэнні вайны і звароту да мірнага жыцця.

У часе нарады Палітбюро знаёмілася таксама з ходам справаздачна-выбарных сходаў у пярвічных партыйных арганізацыях, а таксама першых павятовых і гарадскіх канферэнцыяў. Палітбюро адзначыла, што ў партыйнай дыскусіі члены партыі звярнулі асаблівую ўвагу на выкарыстанне існуючых рэзерваў у прамысловасці і ў сельскай гаспадарцы.

ПЛЕНАРНЫЯ ПАСЯДЖЭННІ ВК ПАРП

29 студзеня адбыліся пленарныя пасяджэнні Ваяводскіх камітэтаў ПАРП у Ольштыне і Кашаліне. На пасяджэнні ВК ПАРП у Ольштыне абмяркоўвалася праграма рэалізацыі пастаноў Палітбюро ЦК аб далейшым удасканальванні кадравай палітыкі і павышэнні ўзроўню кіруючых кадраў. У пасяджэнні прымаў удзел намеснік члена Палітбюро, сакратар ЦК ПАРП С. Каня.

Задачы партарганізацый у пашырэнні грамадска-прадукцыйнай актыўнасці сярод кашалінскага грамадства былі тэмай пленарнага пасяджэння Ваяводскага камітэта партыі ў Кашаліне. У нарадзе ўдзельнічаў сакратар ЦК ПАРП С. Кавальчык.

ВІЗІТ Э. ГЕРКА

2 лютага І сакратар ЦК ПАРП Э. Герэк наведаў Велькапольску. Цікавіўся ён праблемамі сельскай гаспадаркі, жывёлагадоўляй і сацыяльна-бытавымі ўмовамі рабочых калектываў.

СУСТРЭЧА Э. ГЕРКА

1 лютага І сакратар ЦК ПАРП Э. Герэк правёў сустрэчу з прадстаўнікамі амерыканскага банка Д. Ракфелерам і М. В. Куранам. Тэмай размоў былі некаторыя праблемы, звязаныя з польска-амерыканскім гаспадарчым абменам.

Ю. ФАЙКОЎСКІ — НАМЕСНІК МІНІСТРА КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА

Старшыня Рады Міністраў назначыў др Ю. Файкоўскага намеснікам міністра культуры і мастацтва. (яц)

ГП БГКТ і ПА БГКТ у Варшаве выказваюць глыбокае спачуванне інструктару ГП БГКТ на варшаўскі аддзел

ВІКТАРУ ШВЕДУ

з прычыны смерці маці.



ВАЯВОДСТВА

ВЫСОКІЯ ГОСЦІ НА БЕЛАСТОЧЧЫНЕ

Беласточчыну наведалі члены Палітбюро ЦК ПАРП: прэм'ер Пётр Ярашэвіч і віцэ-прэм'ер Мечыслаў Ягельскі. Візіт праходзіў у рабочай атмасферы. Адбылася сустрэча з экзекутывай ВК ПАРП, потым госці разам з партыйнымі і адміністрацыйнымі ўладамі ваяводства наведалі беластоцкія прадпрыемствы: фабрыку прыладаў і ухвытаў, дзе вялі непасрэдныя размовы з рабочымі (фабрыка гэтая належыць да перадавых у краіне), далей госці пабывалі ў «Хлодні складовай» і «Мясных закладах». Потым пабывалі на будоўлі цукроўні ў Лапах і сустрэліся з яе будаўнічымі. Увечары Пётр Ярашэвіч і Мечыслаў Ягельскі сустрэліся з гмінным актывам у Саколах. Цікавіліся, як працуе гміна і як служыць гаспадарам.

ЧАРГОВЫЯ ПАРТЫЙНЫЯ КАНФЕРЭНЦЫІ

Чарговыя павятовыя партыйныя справаздачна-выбарныя канферэнцыі адбыліся ў Аўгустове, Беластоку, Голдапе, Элку і Сэйнах. Галоўныя тэмы: грамадска-гаспадарчыя і ідэалагічныя праблемы ў мінулай кадэнцыі, праграма працы на наступныя два гады і выбар дэлегатаў на Ваяводскую партыйную канферэнцыю. На кожнай павятовай канферэнцыі прысутнічаў адзін з членаў экзекутывы ВК ПАРП.

16 БЕЛАСТОЦКІХ МІЛЬЁНАЎ НА ФОНД АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

16 мільёнаў злотых унеслі ў студзені жыхары ваяводства на фонд аховы здароўя. Асабліва вялікі ўдзел праявіла тут вясковая моладзь. Беласточчына дараўняла ў гэтым зборы да такога багатага ваяводства, як Катавіцкае (таксама 16 мільёнаў зл. у студзені).

БЕЛАСТОЦКІ ДОМ ГАНДЛЁВЫ Ў ВАРШАВЕ

У Варшаве на Алеях Уяздоўскіх будзе адкрыты Дом гандлёвы з беластоцкімі таварамі. Прадаўшчыцы будуць апрануты ў нацыянальныя ўборы Беласточчыны.

НАЙЛЕПШАЙ У КРАІНЕ...

...аказалася Беластоцкая станцыя ацэнкі насення. Яна атрымала пераходны сцяг міністра сельскай гаспадаркі і прафсаюза сельскагаспадарчых рабочых.

МАЛАДЗЁЖНЫ ПАТРАНАТ ЗДАЕ ЭКЗАМЕН

45 маладых сем'яў атрымала кватэры ў першым будынку, пабудаваным пад патранатам ЗМС. (вл)

ГП БГКТ, ПА БГКТ у Беластоку і калектыў «Нівы» выказваюць глыбокае спачуванне члену ГП БГКТ, старшыні Аддзела БГКТ у Беластоку і публіцысту «Нівы»

МІКАЛАЮ ГАЙДУКУ

з прычыны смерці бацькі.



Niedziela 11.II.
7.40 Program dnia. 7.45 TV Kurs Rolniczy. 8.20 „Przypominamy, radzimy". 8.30 „Nowoczesność w domu i zagrodzie". 9.00 TELERANEK. 10.20 „Antena". 10.35 Program oświatowy. 11.05 „Winobranie 72" — rep. film. 11.45 Dziennik. 12.00 Sprawozdawczy magazyn sportowy. 13.30 „Przemiany". 14.00 Dla dzieci: L. J. Kern — „Mój przyjaciel samochód" cz. II („Karampuk"). 14.30 „W Klubie" — wieczór drugi. 15.10 „Kopernik" — film dok. („Epoka i ludzie") cz. I. 15.40 Sprawozdanie z Mistrzostw Europy w jeździe figurowej na lodzie — Pokazy mistrzów. 17.30 „Program widzów" („W starym kinie"). 18.30 „Tele-Echo". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik 20.05 „Powroty" — film TVP („Chłopi") odc. XII. 20.55 PKF. 21.05 „How do you sir?" czyli „Uśmiech i piosenka angielska". 22.00 Magazyn sportowy.

Poniedziałek 12.II.
12.45 TV Technikum Rolnicze: Matematyka — „Prawa logiki". 13.20 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin — „Przewidywanie pogody". 15.20 i 22.35 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Fizyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Zwierzyniec". 17.25 „Echo stadionu". 17.50 TV Kurier Kielecki. 18.10 „Oferty". 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Eureka". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Teatr TV: W. Perzyński — „Szczęście Frania". 21.15 Publicystyka międzynarodowa. 21.45 Gra Wiktor Tretiakow (ZSRR) — skrzypce. 22.15 Dziennik.

Wtorek 13.II.
9.05 „Powroty" — film TVP („Chłopi") odc. XII. 10.00 Dla szkół: (kl. IV) „Przy ulicy Floriańskiej w Krakowie". 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 TELEWIZJA MŁODYCH. 18.25 TV Kurier Mazowiecki. 18.45 „150 rejsów „Turleja" („Morskie spotkania"). 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.00 „Miłosne rozterki" — film fab. ang. 20.55 „Teatr i poezja" (rzecz o teatrze E. Brylla). 21.40 „Goyam Neluma" — „Żniwa ryżowe" — tańce i melodie Sri Lanka (dawniej Cejlon). 22.05 „Kwadrans" — fel. film. 22.25 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.50 TV Technikum Rolnicze: Matematyka — „Prawa logiki". 23.20 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin — „Przewidywanie pogody".

Środa 14.II.
9.00 „Miłosne rozterki" — film fab. ang. 9.55 Dla szkół: (kl. VI) Fizyka — „Śladami Archimedesa" 10.55 Dla szkół: (kl. VII—VIII) Wychowanie plastyczne — „Sztuka ludowa". 11.55 Dla szkół: (kl. VII) Historia — „Wiek odkryć i wynalazków". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Zoologia. 13.20 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt. 14.50 „Wybieramy zawód". 15.20 i 22.45 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Matematyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodych widzów: „Czas na czas". 17.10 Dla dzieci: „Wesołe minutki" — program TV Radz. 17.30 „Informacje-Towary-Propozycje". 17.55 „Przez Afrykę" — film dok. czechosł. cz. I. 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Starty". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Studio 63: M. Żuławski — „Korek" („Opowieści mojej żony"). 20.20 „Szpieg cesarza" — film fab. franc. („Nauczyciel"). 21.45 „Asceza" („Balet"). 22.15 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Cwartek 15.II.
8.55 „Szpieg cesarza" — film fab. franc. („Nauczyciel"). 9.55 Dla szkół: (kl. VI) Historia — „Szabla i rapier". 10.55 Dla szkół: (kl. VII) Język polski — A. Fredro „Zemsta". 14.00 Matematyka w szkole: „Pomiar pojemności i ciężaru". 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Ekran z bratkiem". 17.45 PKF. 17.55 „ZSRR — 50" — Moskwa. 19.10 „Przypominamy, radzimy". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Teatr Kobra J. Cosmos — „Pomarańcze". 21.10 „Refleksje". 21.40 „Kobieta wierna" („Wieczorowy Uniwersytet dla Starszych Panów"). 22.25 Dziennik. 22.55 TV Technikum Rolnicze: Zoologia. 23.25 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt.

Piątek 16.II.
8.30 „Śmiertelny wróg" — film fab. radz. 9.55 Dla szkół: (kl. VI) Geografia — „Wyżyna Śląska". 10.55 Dla szkół: (kl. VIII) Wychowanie obywatelskie — „Polska w roku 2000". 11.55 Dla szkół: (kl. VIII) Chemia — „Pożyteczne związki wapnia". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Chemia — „Budowa atomu a układ okresowy pierwiastków". 13.20 TV Technikum Rolnicze: Zoologia — „Pierwotniaki". 15.20 i 22.40 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Rysunek techniczny. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 ‚Pora na Telesfora". 17.25 „Nie tylko dla pań". 17.45 „Gramy o telewizor". 18.10 „Turystyka i wypoczynek". 18.25 TV Kurier Mazowiecki. 18.45 „Perspektywy techniki". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Minuty grozy" — nowela film. NRF. 20.30 Panorama Tygodnia. 21.10 Teatr TV: W. Falkowska — „Nie mam nic do powiedzenia" („Proszę wstać, sąd idzie"). 22.15 Dziennik.

Sobota 17.II.
8.05 „Marzenia miłosne" — film fab. węg.-radz. — cz. I. 9.55 Dla szkół: (kl. V) Geografia — „U stóp wulkanów". 10.55 Dla szkół. (kl. VIII) Nauka o człowieku — „Skóra". 14.20 TV Technikum Rolnicze: Chemia — Budowa atomu a układ okresowy pierwiastków". 14.55 TV Technikum Rolnicze: Zoologia — Pierwotniaki". 15.25 Program dnia. 15.30 Program I proponuje. 15.50 Redakcja Szkolna zapowiada. 16.05 TV Informator Wydawniczy. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodych widzów: „Ostatki ośmioklasistów". 17.40 Finał XI Olimpiady Wiedzy Rolniczej. 18.35 „Godzina Orfeusza". 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 „Marzenia miłosne" — film fab. węg.-radz. cz. I. 22.05 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.40 Teatr Rozrywki: „850 milionów" wg R. Thomasa. 23.45 „Studio przebojów" — program rozr. TV NRD.



Piątek, 9 lutego
8.15 Film fab. 10.00 Szkoła szachowa. 10.30 Mistrzostwa Europy w jeździe figurowej na lodzie. 12.15 Filmy dokument. 14.15 Program dnia. 16.25 Wieczór twórczy teatru włókniarzy z Grodna. 17.30 Koncert. Transmisja z Pałacu Zjazdów. 19.00 Czas. 19.30 Mistrzostwa Europy w jeździe figurowej na lodzie.

Sobota, 10 lutego
7.00 Program dnia. 8.00 Białe i czarne. 10.55 Przegląd międzynarodowy. 11.10 Tańczcie z nami. 12.40 Film fab. 15.00 Mistrzostwa Europy w jeździe figurowej na lodzie. 17.45 Filmy animowane. 18.15 Spektakl teatralny. 19.00 Czas. 19.30 c.d. spektaklu. 20.35 Śpiewa E. Chil. 21.05 Mistrzostwa Europy w jeździe szybkiej na lodzie.

Niedziela, 11 lutego
7.00 Program dnia. 8.00 Dla żołnierzy. 8.30 Kiosk muzyczny. 9.00 Mistrzostwa Europy w jeździe figurowej na lodzie. 12.45 Hokej. „Skrzydła Rad" — CSKA (2 i 3 tercja). 14.15 Klub filmowy. 15.00 Mistrzostwa Europy w jeździe figurowej na lodzie. 18.00 Ekran dokumentalny. 19.00 Czas. 20.15 Mistrzostwa Europy w jeździe szybkiej na lodzie.

ЛЮДЗІ ДОБРАЙ РАБОТЫ

БЯЛЯВІЦКІЯ ГАСПАДАРЫ



Аляксандр Госцік. Нягледзячы на пажылы ўзрост, гадуе многа кароў і свіней, прадае дзяржаве паўтары тоны мяса ў год.

Ульян Госцік. Дома мае вельмі цяжкія ўмовы (хворая жонка). Хаця на гаспадарцы працуе сам, выконвае ўсе абавязкі, тэрмінова купляе і прымяняе мінеральныя ўгнаенні. У вёсцы гавораць пра яго: працавіты чалавек.



Аляксей Дарашкевіч. Прапагандыст квашонак як корму жывёле. Адзін з першых у вёсцы зрабіў у сябе сіласную яму. У яго гаспадарцы быў зроблены паказ квашэння жыта. Ён першы сакратар партыйнай арганізацыі і член праўлення сельгасгуртка.



Ульян Марцінчык. Пражыў ужо больш 70 год. Быў адным з арганізатараў, а потым скарбнікам сельгасгуртка ў Бялявічах. Зараз як пенсіянер дапамагае і раіць малодшым дзецям.

Фота А. Карпюк



БЕЛАРУСКІЯ КНІГІ

У кнігарні ў Гайнаўцы, вул. 1 Мая 34, можна набыць наступныя кнігі на беларускай мове:

Андэрсен Ганс-Хрысціян, Дзікія лебедзі, 1969, цана 3 зл. 60 гр.

Казка вядомага дацкага пісьменніка. Каляровымі густоўнымі малюнкамі аздобілі выданне С. Кавалёў і У. Рудакоў.

Рэкамендуем усім грамадскім і школьным бібліятэкам, а таксама бацькам, як дасканалы падарунак дзецям малодшага школьнага ўзросту.

Вітка Васіль, Чытанка-маляванка, 1971, стар. 96, цана 11 зл. 50 гр.

Вельмі карыснае выданне твораў для дзяцей, якое выйшла з-пад пяра вядомага беларускага пісьменніка. У кнігу, аздобленую прыгожымі каляровымі ілюстрацыямі мастака А. Луцэвіч, увайшлі вершаваныя ладачкі-ладкі, пацешкі, скорагаворкі, лічылкі, гульні, казкі, загадкі, задачкі, вершы пра птушак і г.д.

Кнігу рэкамендуем настаўнікам беларускай мовы ў пачатковых класах, выхавацельніцам дзіцячых садоў, усім грамадскім бібліятэкам і бібліятэкам пачатковых школ, як дасканалую пазіцыю і для чытання дзецям і для выкарыстання настаўнікамі на ўроках і ў часе арганізавання розных дзіцячых гульняў.

Бічэль-Загнетава Данута, Рыжая Палянка, 1971, цана 1 зл. 90 гр.

Паэма сучаснай беларускай пісьменніцы. Карысны твор для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Каляровыя ілюстрацыі мастака Н. Шчаснай.

Рэкамендуем усім грамадскім і школьным бібліятэкам, а таксама бацькам як карысны падарунак сваім дзеткам-малалеткам.

Корбан Уладзімір, Закаханы морж, 1972, стар. 176, цана 6 зл. 80 гр.

Зборнік баек і фельетонаў — дасціпнага гумару вядомага сучаснага беларускага байкапісца.

Рэкамендуем усім нашым чытачам як дасканалую крыніцу паляпшэння свайго настрою, а ўдзельнікам мастацкай самадзейнасці — зборнік, з якога шмат што можна выбраць для сцэны.

Кнігарня ў Гайнаўцы ахвотна высылае кнігі за паштовым залічэннем (з далучэннем рахункаў, калі гэтага патрабуе пакупнік). Запатрабаванні кіруйце па адрасу: «Dom Książki», Hajnówka ul. 1 Maja 34, woj. białostockie. (мг)

ЦІ ВЕДАЕЦЕ, ШТО...

...у Гайнаўскім павеце да 1975 года будзе электыфікавана 15 вёсак.

...у Беластоцкім ваяводстве існуе 2305 крамаў, у тым ліку 400 спажывецкіх кіёскаў. 2/3 вясковых крамаў знаходзіцца ў прыватных кватэрах. Ва ўсіх крамах працуе 35800 прадаўшчыц і прадаўцоў.

...зараз на Беласточчыне ёсць 102 тысячы гарцэраў і зухаў. (яц)

ВУЧНЁЎСКАЯ СЕСІЯ

Нядаўна ў доме «Ляснік» у Гайнаўцы адбылася папулярна-навуковая сесія, прысвечаная 50-ай гадавіне СССР. Удзельнікамі гэтай сесіі былі вучні беларускага ліцэя. Спачатку вучаніца Зіна Вішнеўская прачытала даклад аб развіцці Савецкага Саюза. Затым выступіў вучань Лаўрашук. У прачытаным ім дакладзе гаварылася аб дапамозе СССР іншым дзяржавам, аб сяброўстве з Польшчай, аб дасягненнях Савецкага Саюза ў развіцці навукі і тэхнікі. Наступны даклад прачытала вучаніца Надзя Баравік.

Потым была мастацкая частка. Першымі тут выступілі вучні і вучаніцы II класа. Прадставілі яны «Przedstawienie okolicznościowe». У міжчасе Аля Вдоўская заспявала дзве песні «Ленин» і «Я люблю тебя, жизнь», а дзве вучаніцы з трэцяга — «Беларусь» і «Беларускія партызаны». На заканчэнне Вішнеўская заспявала песню «Я люблю бярозку». Затым выступіў школьны хор, які заспяваў некалькі беларускіх і польскіх песень.

Люба Сахарчук
Гайнаўскі беларускі ліцэй



З гісторыі мінулых змаганняў

Нядаўна мы пісалі аб «Праваднiку-інфарматары па Музеі гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Гайнаўцы» («Ніва» ад 31 снежня 1972 г.) Барыса Нікіцюка, а гэтымі днямі ўжо выйшла не менш каштоўная праца гэтага аўтара «Перамога, акупленая крывёю»*). Невялікую па аб'ёму гэтую кнігу (усяго 80 старонак) выдала праўленне аддзела прафесіянальнага саюза працаўнікоў лесу і драўніннай прамысловасці ў Беластоку супольна з Музеем рэвалюцыйнага руху ў Беластоку пад рэдакцыяй Мечыслава Хаі — намесніка галоўнага рэдактара «Газеты Беластоцкай». Уступны артыкул належыць Віктару Тэслюку — старшыні праўлення аддзела прафсаюзаў працаўнікоў лесу і драўніннай прамысловасці ў Беластоку.

Выхад у свет гэтай працы вельмі карысна папаўняе існуючы прабел у нашых ведах па гісторыі змаганняў працоўных Беласточчыны ў міжваенны перыяд. Яе вартасць вялікая яшчэ і таму, што кніга прысвечана трохмесячнай забастоўцы лясных рабочых і возчыкаў Сакольскага і Беластоцкага паветаў у 1933 — 1934 гадах — забытай старонцы барацьбы працоўных усходняй Беласточчыны супраць санацыйнай улады за паляпшэнне ўмоваў працы і жыцця. Аўтар грунтоўна дакументуе падзеі не толькі фактамі з малавядомых архіўных і друкаваных крыніц, але ўводзіць упершыню ў навуковы зварот сабраныя ім успаміны ўдзельнікаў славутай забастоўкі. Гэты каштоўны аўтэнтычны матэрыял праз дзесяць-дваццаць год мог бы беспаваротна загінуць.

У кнізе знаходзім характарыстыку эканомікі Беластоцкага і Сакольскага паветаў у міжваенны перыяд, якая датычыць лясной гаспадаркі. Прадстаўлены грамадска-эканамічныя ўмовы лясных рабочых. У спецыяльным раздзеле паказаны стан і ўплывы палітычных партый у асяроддзі сялян і лясных рабочых Сакольшчыны і Беласточчыны. Затым вельмі дакладна аўтар прадставіў выбух і ход забастоўкі, падзеі 4 студзеня 1934 года ў Шудзялаве, у часе якіх ад куляў «гранатовай» паліцыі загінуў дваццацігадовы рабочы з вёскі Суражкова Мікалай Хомчык, а чацвёра іншых удзельнікаў забастоўкі былі паранены. Крывавая расправа паліцыі над бастуючымі не спыніла барацьбы. Бастуючыя яшчэ мацней згуртаваліся і, атрымаўшы падтрымку ад лясных рабочых іншых рэгіёнаў краіны, вялі паслядоўнае змаганне да пераможнага канца. Забастоўка закончылася перамогай рабочых. Санацыйныя ўлады вымушаны былі павысіць заработную плату і даць шэраг палягчэнняў лясным рабочым і возчыкам, а ўсю сваю нянавісць вылілі ў праследаванні членаў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і Саюза камуністычнай моладзі Заходняй Беларусі, гэта значыць, арганізацый, якія былі правадыром і натхніцелем барацьбы працоўных. Гэтая расправа знайшла выраз у славутым судовым «працэсе 29» і іншых працэсах, што адбываліся ў 1934 і 1935 гадах у Беластоцкім акруговым судзе.

Усе гэтыя падзеі падаюцца на фоне змаганняў працоўных міжваеннай Польшчы, паказваецца супрацоўніцтва і салідарнасць сялян і рабочых у іх супольнай барацьбе супроць санацыйных уладаў, фабрыкантаў і абшарнікаў.

Кнізе ўласціва даступнасць формы, прадуманы каментарый фактаў, значная колькасць фотаздымкаў удзельнікаў забастоўкі і фотакопій розных дакументаў. У канцы кнігі змешчаны дадатковыя матэрыялы, сярод якіх асаблівую каштоўнасць прадстаўляе асабовы склад раённых камітэтаў і арганізацый Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў Сакольскім і паўночнай частцы Беластоцкага паветаў.

Словам, з-пад пяра мгр Барыса Нікіцюка выйшла каштоўная праца. Вельмі шкада толькі, што яна выдадзена ў колькасці ўсяго 500 экземпляраў і не паступіла ў кнігарні, застаючыся выключна ўнутраным выданнем ПА ПСПЛіДП і Музея рэвалюцыйнага руху ў Беластоку. Яна ж павінна апынуцца не толькі ў руках гісторыкаў, але і шырокага кола чытачоў на Беласточчыне, якія з асаблівым зацікаўленнем і ўдзячнасцю сустракаюць выданні, якія датычаць гісторыі іх роднага рэгіёну.

Мікалай Гайдук

*) Borys Nikitiuk, „Zwycięstwo opłacone krwią", Białystok 1972.

Этнаграфічнае акенца



Капліцка над помнікам пры ўездзе ў вёску Новая Луплянка, Беластоцкага павету. *Фота М. Гайдука.*

КАЛІ ЎЖО БУДЗЕ РАДАСЦЬ У ШКОЛЕ?

У кожнай вёсцы ёсць свае клопаты. Жыхароў вёскі Чыжы, асабліва ж яе настаўнікаў, ужо амаль 20 год няспынна грызе адзін вялікі клопат. Менавіта: у разлеглай і знанай на Гайнаўшчыне вёсцы, дзе ёсць прасторная святліца, новы, прыгожы пункт аховы здароўя з кватэрай для доктара, кіёск «Руху», шырокая вуліца з тратуарамі, па якой ходзіць чуць не як у горадзе часта аўтобус, няма добрай школы. А чыжоўскім дзецям бракуе яе, як паветра, тым больш, што ходзяць сюды не толькі яны, але і дзеці з суседніх вёсак Збуч, Ракавічы.

Чыжоўская васьмігодка змяшчаецца дагэтуль аж у васьмі будынках, з чаго два класы знаходзяцца ў старым царкоўна-прыхадскім вучылішчы, якое памятае яшчэ часы напалеонаўскага нашэсця і, як кажуць, будынак гэты даўно ўжо пара развалiць, рэшта ж класаў змяшчаецца ў прыватных будынках мясцовых жыхароў. «Найдаўжэйшы калідор — 1500 метраў — гэта ў нашай школе», — жартуюць з горкай усмешкай тутэйшыя настаўнікі. Справа новай школы не сходзіць з іх вуснаў пры сустрэчы з прадстаўніком рэдакцыі.

За будынкам старога царкоўна-прыхадскога вучылішча пасля шматгадовых стараннаў растуць нарэшце падмуркі новай школы, разлічанай на 200 месц, з шасцю класнымі пакоямі і адной працоўняй. Бельскае рамонтна-будаўнічае прадпрыемства абяцала здаць школу (4-мільённую інвестыцыю) ў эксплуатацыю 25 жніўня гэтага года. Памятаючы аднак усю валакіту са школай, настаўнікі не зусім пераканаaны, што нарэшце іх клопаты скончацца і 1 верасня яны разам з дзецьмі змогуць пераступіць парог новай школы.

Мейма аднак надзею, што ўжо на гэты раз сумныя думкі чыжоўскіх настаўнікаў не апраўдаюцца: пад клапатлівай апекай куратары справа тутэйшай школы будзе шчасліва завершана, будаўнікі не падвядуць, аддаючы будынак у карыстанне дзецям у абяцаным тэрміне, і 1 верасня 1973 года зазвініць урачысты званок у новай, доўгачаканай школе ў Чыжах. Будзе тады вялікая радасць у школе.

Ада Чэчуга

Ф·А·Л·Ь·К·Л·О·Р

СІРОЦКАЯ

Allegro



Пры-лі-та-е чор-ны во-рон на-шу во-ду пі-



ті. Ой, як тяж-ко сі-ро-ті-не бэз ба-тэнь-ка жы–

Прылітае чорны ворон нашу воду піті.
Ой, як тяжко сіротіне бэз батэнька жыті!
Ой, як тяжко сіротіне бэз батэнька жыті!
Чужы батько, чужы батько шчэй маті чужая.
А хто ж мэнэ пошкодуе, хоть я й молодая?
А хто ж мэнэ пошкодуе, хоть я й молодая?
Посядают вэчэраті — з деткамі говорат,
А до мэнэ, молодоі, слова нэ промовят.
А до мэнэ, молодоі, слова нэ промовят.
Посядают вэчэраті — з деткамі сміются,
А ў мэнэ, сіротіны, дробны слёзы льются.
А ў мэнэ, сіротіны, дробны слёзы льются.
Ой, пуйду я то й у поле роботу робіті,
Ой, як стану там плакаті — ўсем анёлам чуті.
Ой, як стану там плакаті — ўсем анёлам чуті.
Прылітае одін анёл з высокого нэба:
— Чого плачэш, сіротіно? Чого тобе трэба?
Чого плачэш, сіротіно? Чого тобе трэба?
Даў я й тобе рукі-ногі шчэй светлые очы —
Робі, робі, сіротіно, до тэмноі ночы!
Робі, робі, сіротіно, до тэмноі ночы!
— А коб я й жэ, а коб я жэ дэнь і ноч робіла,
То тут моя роботонька нікому нэ міла.
То тут моя роботонька нікому нэ міла.

Ад Марыі Парфенюк, 1951 года нараджэння, Ані Грыгарук, 1945 года нараджэння, і Ніны Грыц, 1952 года нараджэння, вёска Кленікі Гайнаўскага павету, запісаў 15 лістапада 1972 г. Мікалай Гайдук. З магнетафоннай стужкі нотны запіс зрабіў Эдуард Гойлік.

Пачатак на стар. 1



Фатаграфія — выхаваўчы сродак

З фатаграфаваннем М. Зубрыцкі пазнаёміўся бліжэй, калі ў 1959 г. пасля заканчэння Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання ў Гайнаўцы паступіў на аддзяленне фізікі з хіміяй Настаўніцкай студыі ў Беластоку. Там, у студэнцкім фатаграфічным гуртку, ён не толькі захапіўся гэтым відам мастацтва, але і здабыў у ім падставовыя веды. І яны прыдаліся ўжо ў першым годзе настаўнічання. У школе ў Кляшчэлях нікому з настаўнікаў не ўдавалася ўтаймаваць групу вучняў, што да вучобы зусім не прыкладаліся, затое «паразрабляць» у школе ды ў мястэчку надта ж любілі. Тое, што не змаглі зрабіць выхаваўцы з шматгадовым стажам, зрабіў пачынаючы настаўнік М. Зубрыцкі. Маючы ўсяго толькі фотаапарат «Друг», ён заахвоціў лобузаў да фатаграфіі. Хлопцы так захапіліся фатаграфаваннем, што сядзелі ў школе па цэлых днях і на крок не адступалі ад свайго настаўніка. Займацца ж у фатаграфічным гуртку мелі права толькі тыя, хто добра вучыўся і вёў сябе бездакорна. Праз некалькі месяцаў былыя разраблякі сталі добрымі вучнямі, а тоўстая кніга школьнай хронікі была аздоблена зусім удалымі здымкамі. Школа ж дзякуючы намаганням фоталюбіцеляў узбагацілася ладна абсталяванай фатаграфічнай лабараторыяй.

Працуючы ў Нараўцы, М. Зубрыцкі патрапіў захапіць фатаграфаваннем не толькі сваіх выхаванкаў, але і пазашкольную моладзь. Пры дапамозе аддзела культуры ППРН у Гайнаўцы ён арганізаваў у нараўчанскім цэнтры культуры належна абсталяваны фатаграфічны кабінет, у якім у вольны ад працы час займалася некалькі дзесяткаў чалавек. Лепшыя працы гуртка аздобілі не толькі грамадскі асяродак культуры ў Нараўцы, але экспанаваліся таксама ў грамадскім доме культуры «Гурнік» у Гайнаўцы.

Калі ў 1969 г. М. Зубрыцкі прыйшоў працаваць дырэктарам пачатковай школы ў Крыўцы, спачатку не магло быць і мовы аб арганізаванні фатаграфічнага кабінета. Школа павінна была ўладкаваць шмат гаспадарчых і дыдактычных спраў, а перш за ўсё павысіць узровень навучання. Цяпер школа ўжо стала «на ногі», яе вучні займаюць адно з першых месц у розных павятовых алімпіядах і конкурсах, выпускнікі паступаюць у агульнаадукацыйныя ліцэі Гайнаўкі і тэхнікумы Беластока. І дырэктар М. Зубрыцкі можа выдзеліць крыху часу свайму хобі. У мінулым годзе ён закончыў 3-гадовы кваліфікацыйны курс фатаграфавання і фільмавання другой ступені ў Беластоку. Адразу ж абсталяваў усім неабходным школьны кабінет фатаграфіі і фільму. На заняткі фатаграфічнага гуртка хадзіла каля 60 вучняў і вучаніц. Летам яны падрыхтавалі кароткаметражны фільм-хроніку аб працы дзяцінца ў Крыўцы. Каляровае фатаграфаванне і фільмаванне захапіла крывецкіх школьнікаў, а «паляванні» з фотаапаратам па маляўнічых ваколіцах роднага сяла і суседняй Лядскай пушчы стала іх любімым заняткам у вольны час. Бацькам гэта таксама прыйшлося да спадобы: ва ўзнагароду за добрую навуку набываюць дзецям фатаграфічныя апараты, а лепшыя працы школьнікаў знаходзяцца не толькі ў школьных зборах, але і ў сямейных хроніках.



М. Зубрыцкі. Фота Я. Цялушэцкага.

Увосень мінулага года, калі я наведаў М. Зубрыцкага ў Крыўцы, ён намерваўся пашырыць сваю дзейнасць і заняцца інструктарскай працай па фатаграфаванню і фільмаванню пры павятовай парадні культуры ў Гайнаўцы. Ён спадзяецца, што іншыя настаўнікі Гайнаўшчыны таксама зацікавяцца гэтым надта ж займальным і карысным відам пазакласнай працы школьнікаў.

Мікалай Гайдук

КОНКУРС — ДРУГІ ГОД

ГАСПАДАРНАЯ І КУЛЬТУРНАЯ

Згодна з пастановай Сакратарыята ЦК ПАРП, Цэнтральныя дажынкі 1973 адбудуцца ў Беластоку. Будзем гаспадарамі ўсіх гаспадароў з Польшчы. Трэба ж сказаць, што на тое, каб быць гаспадаром дажынак, трэба заслужыць. Наша беластоцкая вёска заслужыла гэтага перш за ўсё высокай дынамікай росту сельскагаспадарчай прадукцыі. Гаварыў аб гэтым на пленуме ВК ПАРП тав. К. Барцікоўскі, намеснік члена Палітбюро ПАРП.

Аднак для беластоцкай вёскі была характэрна не толькі высокая дынаміка росту прадукцыі. Сакратар ЦК ПАРП тав. Е. Лукашэвіч, выступаючы на нарадзе актыву ў Беластоку, даў станоўчую ацэнку конкурсу «Беластоцкая вёска — гаспадарная і культурная», як цікавай ініцыятыве ўвядзення масавага спаборніцтва на вёсцы. У ніводным ваяводстве ў краіне няма такога, а ў сувязі з тым да нас прыглядаюцца, ад нас будуць вучыцца. Гэта будзем таксама паказваць у часе Цэнтральных дажынак.

Нядаўна праведзена ўступная ацэнка вынікаў конкурсу «Беластоцкая вёска — гаспадарная і культурная». Абмяркоўваліся некаторыя справы адносна арганізацыі спаборніцтваў на вёсцы ў будучым годзе.

Хаця конкурс быў арганізаваны першы раз, аказаўся ён вельмі добрай формай актывізацыі вёскі. Да конкурсу калектыўна прыступіла больш чым дзве тысячы вёсак, а сем тысяч гаспадароў спаборнічала за званне «Узорнага гаспадара» і «Майстра сельскагаспадарчай прадукцыі».

Калектывы, якія ацэньвалі конкурс, вельмі часта адзначалі ў сваіх пратаколах значныя вынікі ў галіне жывёлагадоўлі і вырошчвання збожжа. Нямала зроблена ў галіне культурнай актывізацыі і эстэтыкі нашых вёсак. Найлепшыя вынікі ў спаборніцтве дасягнулі паветы Алецкі, Аўгустоўскі, Голдапскі, Ломжынскі і Элцкі.

Добрыя вынікі конкурсу не могуць засланіць недахопаў. Проста ў некаторых паветах і вёсках арганізатары пераняліся рэкордамі і пачалі старацца выказацца статыстычнымі данымі. А трэба ж напомніць, што найважнейшай мэтай конкурсу з'яўляецца вызначэнне сабе такіх заданняў, якія ў даным рэгіёне цяжкія да ўвядзення, не ўдаюцца, а не рэгістраванне вынікаў у галінах сельскагаспадарчай прадукцыі ці культуры, якія даўным-даўно з'яўляюцца моцным бокам вёскі.

Правілы конкурсу, які будзе праводзіцца ў гэтым годзе, крыху зменяцца. Індывідуальныя ўдзельнікі конкурсу будуць абавязаны выбраць пяць заданняў, а калектывы — дзесяць. Ваяводскія правілы конкурсу будуць толькі ўказаннем, а падрабязныя заданні распрацуюць рэгіянальныя камісіі, дапасоўваючы іх да сваіх патрэб.

Трэба спадзявацца, што ў гэтым годзе і іншыя паветы актывізуюцца. Няхай аб нашых перадавых гаспадарах даведаліся б і дажынкавыя госці. А. К.

ТАК БЫВАЕ...

КРЫЎДЗІЛА ІХ ЖЫЦЦЁ

Многа бяды, многа гора ў бацькоў, калі памрэ ў іх дзіцё. Нават калі гэтае дзіцё яшчэ малое. У Антона і Аляксандры Цімашукоў, якія родам з Сямяціцкага павету (Антон з Верпаля, Аляксандра з Сяміхочаў) паміралі дзеці. Не паспее заглохнуць адзін нясцерпны боль душы, і зноў у хаце похараны. Памерла адно дзіцё, пасля другое. Не пройдзе нават год часу, і зноў слёзы, зноў крыўдзіць жыццё. Цімашукі адвезлі на могілкі трэцяе, а пасля чацвёртае сваё дзіцё.

Бяда бядою, а жыць трэба. Нікуды не падзенешся. Мусіш агорыць. Цімашукі далей мірна жывуць, далей працуюць на гаспадарцы, нажываюць маёмасць і дзяцей. Асабліва добра развівалася Ніна, хутка расла, сваімі дзіцячымі фіглямі весяліла бацькоў. Але нядоўга. Раптам захварэла на запаленне мозгу і памерла. Моцна галасіла маці, калі засыпалі ў магілу яе дачушку, да якой так пяшчотна, так любоўна адносілася на працягу сямі гадоў. І Антону нешта заціснула горла і цяжка было яму выгаварыць развітальнае слова: «Пращчай, мая пацеха!» І калі б у Цімашукоў не было ўжо больш дзяцей, перажыць ім такі ўдар было б страшэнна цяжка.

Пасля смерці Ніны найбольш увагі прысвячалася Васілю. Быў ён хваравіты. Прызналі лекары туберкулёз пазваночніка. Пры санацыйнай Польшчы нялёгка было з лекарамі і лекамі. Аднак бацькі лячылі сына колькі маглі. Васілёк мучыўся і бацькі з ім мучыліся. Памёр ён на 14 годзе свайго жыцця. І зноў чорнае гора, чорныя дні ў хаце Цімашукоў. Яны людзі моцныя, проста жалезныя. Не сагнуліся і ад гэтага няшчасця.

Праходзіў час. Ён паступова зацягваў чарговыя раны сэрцаў. Жыццё несла новыя справы, новыя клопаты і новыя абавязкі. У Цімашукоў удачна і шчасліва выгадавалася трое дзяцей: Іван, Марыся і Антон. Яны былі прыгожыя і добрыя. Шанавалі бацькоў. Марыся хутка выйшла замуж. Праз нейкі час Антон Цімашук стаў дзядуляй. У Марысі пасыпаліся дочкі. Дзядуля і бабуля любілі сваіх унукаў. Памагалі дачцы іх выхоўваць. Але быў цяжкі і неспакойны час. Нямецкая акупацыя. Падчас сенакосаў гітлераўцы застрэлілі Марысю. Асіраціла яна трое дзяцей. Зноў страшэннае гора ў Цімашукоў. Як далей жыць, што рабіць з сіротамі? Бабуля старалася заступіць ім матку.



Антон і Аляксандра Цімашукі са сваімі ўнукамі.



Нашаніўская пара

АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ — ЧАСТКА І

Нашаніўская пара працягвалася ад 1906 да 1915 года. У 1915 годзе, у сувязі з набліжэннем руска-нямецкага фронту да Вільні, газета «Наша Ніва» перастала існаваць. Нягледзячы на гэта, літаратурная тэндэнцыя, створаная «Нашай Нівай», існавала да 1921 года, гэта значыць, прыблізна на працягу пятнаццаці гадоў. Быў гэта, несумненна, найкарацейшы перыяд у беларускай літаратуры. Найкарацейшы і адзін з найпрыгажэйшых.

На працягу многіх дзесяткаў гадоў сацыяльная, грамадская, рэвалюцыйная свядомасць беларусаў апярэджвала свядомасць нацыянальную. У пачатку XX стагоддзя сацыяльны і нацыянальны элемент у свядомасці беларусаў зраўняліся. Гэта якраз выклікала здзіўленне і з боку рускіх і з боку палякаў. Прагрэсіўныя колы рускіх і палякаў зразумелі заканамернасць такой з'явы. Няма аднак сумненняў, што беларускі рух у гістарычным сэнсе быў з'явай спозненай у параўнанні з усімі нацыянальнасцямі, насяляючымі этнічную тэрыторыю Беларусі. Паслухайма аўтэнтычнае сцвярджэнне савецкага даследчыка: «Революционное движение среди белорусского населения как самостоятельное национальное движение возникло гораздо позже, чем у других национальностей Западного края. Обьясняется это тем обстоятельством, что царское правительство в течение многих поколений вело русификаторскую политику и применяло все меры к тому, чтобы насильственно русифицировать белорусские губерни и уничтожить с корнем белорусскую культуру и язык. Эта насильственная русификация привела к тому, что большие слои городского и сельского населения постоянно ассимилировались. Белорусы в первом периоде революционной борьбы вступали поэтому в русские или польские организации». (С. Агурский, Революционное движение в Белоруссии, Минск 1928 г. с. 103).

Зараджэнне спелага беларускага руху трэба звязваць з заснаваннем Беларускай сацыялістычнай грамады. Арганізацыя гэта заснавана ў снежні 1902 года ў Вільні. Галоўнымі заснавальнікамі БСГ былі браты Антон і Іван Луцкевічы, вядомыя пісьменнікі К. Каставіцкі (Карусь Каганец) і А. Пашкевіч (Цётка), заслужаны гісторык В. Ластоўскі (Верашчака), дзеячы А. Бурбіс, В. Іваноўскі, Ф. Стацкевіч, А. Уласаў, Ф. Умястоўскі. Некаторыя з названых арганізатараў БСГ ігралі ў пазнейшы час значную ролю ў палітычным жыцці БССР і ў беларускім руху ў міжваеннай санацыйнай Польшчы.

Першапачаткова беларуская арганізацыя называлася Беларускай рэвалюцыйнай грамадой. На з'ездзе, які адбыўся ў 1903 годзе, было пастаноўлена перайменаваць арганізацыю ў «Беларускую сацыялістычную грамаду».

Беларуская рэвалюцыйная грамада і Беларуская сацыялістычная грамада былі заснаваны на базе дзейнасці беларускіх рэвалюцыйных груп у Пецярбурзе і беларускіх дзеячоў, якія заставаліся пад уплывам польскага антыцарскага руху. Такім чынам, у аснову беларускага руху і ў аснову праграмы Беларускай сацыялістычнай грамады ляглі прынцыпы рускага рэвалюцыйнага руху і Польскай сацыялістычнай партыі.

У сваёй праграме Беларуская сацыялістычная грамада дамагалася аўтаноміі ў рамках рэспублікі. Гэта значыць, што БСГ звязвала лёс Беларусі з лёсам рускага народа. Праграма БСГ не мела аднак сацыялістычнага характару. Яе імкненні, яе мэты змяшчаліся ў ідэях польскага пазітывізму, праграмы Польскай сацыялістычнай партыі, часткова ў праграмах рускіх народнікаў і меншавікоў. Нягледзячы на гэта, і БРГ і БСГ па сваёй нацыянальнай сутнасці былі арганізацыямі беларускімі.

Для нас галоўнае значэнне БСГ заключаецца ў тым, што далі яны пачатак першым масавым беларускім газетам «Нашай Долі» і «Нашай Ніве».



Машына для ўсіх



Нядаўняе рашэнне нашай партыі і ўраду аб выпуску на рынак малалітражнай легкавой машыны, даступнай для ўсіх і ў горадзе і ў вёсцы, ужо пачало здзяйсняцца!

Штодзень тысячы будучых пакупнікоў акружаюць выстаўленыя для публічнага агляду першыя экземпляры «Фіята — 126 П», асцярожна кранаюць яго лакіраваную паверхню, кідаюць вокам у элегантна абсталяваную сярэдзіну, заглядаюць у рухавік, а нават схіляюцца, каб знізу прыгледзецца да шасі. «Фіят—126 П» — прыгожы, зручны, невялічкі — ужо ўвайшоў у нашае жыццё, размовы, планы, сямейныя нарады. Бо што і казаць — гэтая машына адпавядае нашаму густу і кішэні. Рухавік у ёй сілай у 23 конскія сілы, хуткасць да 110 км у гадзіну, расход паліва 5 — 5,5 л. этыліну на 100 км, памяшчаюцца ў машыне 4 асобы і 40 кг багажу. Можна абсталяваць багажнік таксама на даху на 30 кг і далучыць спецыяльную прычэпу агульнай вагой да 300 кг. Бяспечны руль, халаджэнне рухавіка паветранае. І самае важнае — «Фіят—126 П» недарагі, яго цана 69 тысяч зл.

Гэта машына для разважлівых і ашчадных людзей. Польская ашчадная каса ПКО ўчыніла машыну даступнай для ўсіх! Ад 5 лютага гэтага года можна ўжо ўплочваць усю суму 69 тысяч злотых, але можна плаціць і на раты. Першая ўплата павінна быць не меншай чым 5 тысяч злотых. У залежнасці ад устанаўлення пакупнікам тэрміну атрымання машыны залежыць і велічыня ратаў і апрацэнтаванне ўплочанай сумы: 2 прац., калі пастаўка машыны мае наступіць у 1974—1977 гадах, і 3 прац. — калі ў 1978 — 1980 г.г. Грошы, налічаныя з працэнтаў, залічваюцца ў агульную суму ўплаты за машыну. Калі вы хочаце атрымаць машыну

у	1977 г.	1978 г.	1979 г.	1980 г.
месячная рата складзе	1.300 зл.	990 зл.	810 зл.	680 зл.
кошт машыны будзе	63.740 зл.	59.520 зл.	57.780 зл.	56.100 зл.

Немцы станавіліся ўсё больш свірэпыя. Антона Цімашука арыштавалі. Сядзеў спачатку ў турме ў Беластоку, а пасля вывезлі яго на цяжкія работы ў капальню вугля за Бытамам. Пяць месяцаў ён прамучыўся. Цяжка працаваў, недаядаў, зносіў знявагі. Нарэшце ўцёк. Дамоў ішоў два тыдні. Не трапіў у рукі немцам.

Калі на Беласточчыне ўтварылася народная ўлада, Антон Цімашук жыў ужо ў Беластоку. Тут уступіў у рады ППР і ўключыўся ў грамадскую працу па арганізацыі «сялянскай самапомачы». З ім у Беластоку жыў яго сын Антон, які кахаў дзяўчыну з-за Кнышына. Зімой 1945 года на каляды паехаў ён да сваёй нарачонай. І там закатавала яго рэакцыйная банда. Да бацькі дайшла вестка аб смерці свайго 8-га дзіцяці; паехаў ён на вёску за Кнышын. Там зрабіў труну. Дагледзеў свайго сына — аднайменніка, наплакаўся колькі хацеў і забраў адтуль яго цела. Разам з жонкаю, сваякамі і знаёмымі пахаваў яго. Доўга гаварыў ён яшчэ: «Няхай бы са мною што-небудзь сталася ў замен за смерць сына».

Чаму так няроўна раздзелена шчасце сярод людзей? Адных жыццё песціць сваёй увагай, адорвае радасцямі і ўдачамі, а другіх так гне, так выпрабоўвае, што слабому чалавеку не пад сілу было б перанесці столькі гора. Лёс няўмольны. Антону Цімашуку і яго жонцы Аляксандры за дзяцей было дана доўга жыць. Яны ж яшчэ павінны былі заняцца выхаваннем дзяўчынак сваёй дачкі, нябожчыцы Марысі. Унучку Олю адразу ўзялі да сябе, а Вера і Ніна былі пры бацьку. Бацька гэтых дзяўчынак паехаў у Шчэцін, там ажаніўся. Ён быў патрэбны новай жонцы, але яго дзеці не былі ёй патрэбныя. Яна мела сваё дзіцё.

Мачаха дабілася, каб Веру і Ніну перадаць у сірацінец за Аполем. Калі даведаўся аб гэтым дзядуля, паехаў да іх. Забіраў на каляды і вялікдзень. А калі скончылі яны пачатковую школу, забраў у Беласток да сябе. Дабіўся, каб «апека спалэчна» крыху дапамагала. Тут яны параслі, атрымалі прафесію, павыходзілі замуж. Маюць ужо сваіх дзяцей. Наведваюць часта дзядулю, у якога ёсць 6 унукаў і 7 праўнукаў. Найстарэйшая праўнучка Ёля Васілюк вучыцца ў ліцэі і ў гэтым годзе будзе здаваць экзамен на атэстат сталасці.

Нядаўна Антон Цімашук са сваёю жонкаю Аляксандрай запрасілі сваіх найбліжэйшых і хоць даволі спознена, адзначылі 50-ую гадавіну супольнага жыцця. Былі ўнукі і праўнукі і адзіны сын Іван, які жыве на бацькаўшчыне ў Верпалі. Былі песні і горкія ўспаміны. Антону Цімашуку цяпер 83 гады, а яго жонцы 79 гадоў. Жывуць яны ў драўлянай хатцы. Антон Цімашук ужо даўно на пенсіі. Атрымоўвае каля 1000 зл. Малавата! Дарабляе на паўштаце.

Міхась Хмялеўскі

САЦЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ НА ВЁСЦЫ

Сацыяльнае забеспячэнне грамадзян займае на старонках «Нівы» мала месца, хоць у апошнія гады ахоплівае яно ўсё большыя кругі жыхароў нават сельскагаспадарчых паветаў. У 1972 годзе рознымі формамі гэтых забеспячэнняў было ахоплена 280 тысяч працаўнікоў (без сялян) і звыш 50 тысяч пенсіянераў Беластоцкага ваяводства. Лік апошніх кожны год павялічваецца на 3—4 тысячы асоб. У апошнія гады наступілі ў галіне сацыяльнага забеспячэння вялікія змены на карысць насельніцтва.

Найвялікшым дасягненнем было ўвядзенне ад паловы мінулага года бясплатнага лячэння сялян. Упершыню ў гісторыі вёскі гэта група грамадзян, ад якой заўсёды спецыфіка працы патрабавала высокай фізічнай працаздольнасці, атрымала належную медыцынскую дапамогу. Не вырашыла гэта ўсіх праблем забеспячэння сялян, у тым ліку асабліва важнага паслявыпадковага забеспячэння, шырокай медыцынскай прафілактычнай дзейнасці, атрымліванне пенсіі па старасці пасля перадачы гаспадаркі дзецям і г.д. Але зроблены добры пачатак.

У мінулым годзе былі ўведзены далейшыя ільготы для працаўнікоў іншых прафесій — частковае зраўнанне хварабовых засілкаў, павелічэнне мацярынскіх водпускаў і іншае. Але па-рознаму ўспрымаюцца гэтыя ільготы. У трэцім квартале мінулага года павялічылася неабгрунтаваная адсутнасць на рабоце амаль на 25% у параўнанні з аналагічным перыядам 1971 года, хаця эпідэміі і дрэннага надвор'я не было. У адносінах да некаторых парушальнікаў дысцыпліны працы былі прыняты меры. Нельга аднак чакаць, пакуль іх выявіць кіраўніцтва прадпрыемства ці ЗУС — працаўнікі самі павінны займаць рашучае становішча. Усіх нас абавязвае лозунг добрай працы.

Мінулы год быў добрым годам і для пенсіянераў. Зараз на вёсцы апрача працаўнікоў дзяржаўных кааператыўных устаноў атрымліваюць пенсію рамеснікі, частка членаў сельскагаспадарчых гурткоў, сяляне, якія перадалі зямлю дзяржаве, члены спулдзельняў прадукцыйных і г.д.

Асабліва прыкметна ўзраслі пенсіі для настаўнікаў пасля ўвядзення «Карты настаўніка» і для ваенных інвалідаў. Сярэдняя пенсія ўзрасла, што складае для ваяводства каля 25 мільёнаў злотых у год.

Таксама ў адносінах да гэтай групы грамадзян ЗУС не зможа добра выканаць сваіх абавязкаў без дапамогі насельніцтва. Адразу пры пераходзе на пенсію многа клопатаў стварае падрыхтоўка дакументацыі. Установы стараюцца хутчэй пазбыцца пакалечанага ці старога працаўніка. Згодна з загадам улад, асабліва «Інструкцыяй прэзаса ЗУС» з 6.III.1970 г., якую павінны мець усе прадпрыемствы, адыходзячым на пенсіі трэба аказаць максімальную дапамогу. Незалежна ад гэтага жыхары паўднёва-ўсходняй Беласточчыны могуць звярнуцца па бясплатныя парады ў інфармацыйныя пункты ЗУС пры павятовых радах нарадовых у Гайнаўцы, Саколцы і Сямяцічах, у інспектарат ЗУС у Беластоку, вул. Міцкевіча 52, які арганізаваны ў мінулым годзе, і ў аддзел ЗУС у Беластоку, вул. Складоўскай 37.

Нашым жаданнем было б, каб пенсіянеры ў дзень адыходу з працы змаглі атрымаць паперы на пенсію. Цяжкасці звязаны з доказам патрэбнага перыяду працы або інвалідскай групы. Гэты пераход ад працадаўцы на дзяржаўнае забеспячэнне павінен, згодна з лістам прафсаюзаў нашага ваяводства да радаў рабатнічых з 1972 г. адбывацца адначасова і бяскрыўдна. Неабходна толькі памятаць, што ўстановы маюць права пачаць камплектаванне дакументацыі для пенсіянераў на шэсць месяцаў перад іх адыходам, а ўжо абавязкова тры месяцы ў час развязання дагавору аб працы.

Але як гэта адбываецца ў сапраўднасці, даведаемся з працягу ў наступным нумары «Нівы».

Уладзімір Юзвюк,
намеснік дырэктара аддзела ЗУС у Беластоку.

Вазы, запрэжаныя... трактарам

Усё часцей на нашых дарогах пачалі паяўляцца гаспадарскія вазы, у якія запрэжаны не конь, а трактар. Гаспадары перарабілі гэта самі, забываючы аб адпаведным прыстасаванні такога сродка транспарту да абавязваючых правіл дарожнага руху. У сувязі з гэтым міліцыянеры пачалі штрафаваць гаспадароў. Гаспадары даказвалі, што ім такі сродак транспарту неабходны, тым больш, што маючы ўласны трактар, не трымаюць наогул коней, а ў сувязі з тым няма чым вазіць патрэбных у гаспадарцы тавараў і прадуктаў.

Супярэчнасці і няяснасці вырашыла Міністэрства камунікацыі, прынамсі да 31 снежня 1975 года.

У сувязі з транспартнымі патрэбамі гаспадароў, да вышэй спамянутага тэрміну Міністэрства дазволіла ездзіць па дарогах трактарам з прычэпленымі вазамі, так званымі балёнамі (на гумовых калёсах). Аднак такі транспарт не можа ездзіць на міжнародных дарогах, абазначаных літарай «Е».

Паколькі такія вазы лічацца за сельскагаспадарчыя прычэпы, іх неабходна рэгістраваць у аддзелах камунікацыі павятовых рад.

Напомнім, што сельскагаспадарчыя прычэпы павінны мець наступнае асвятленне:

- два чырвоныя светы ззаду, т. зв. пазіцыйныя;
- два водблескавыя шкельцы ў форме трохвугольніка;
- асвятленне рэгістрацыйнай таблiцы;
- два кірункаўсказы, калі прычэпа закрывае сігналы павароту, які дае кіруючы трактарам.

Апрача таго, спалучэнне возу з трактарам павінна быць дадаткова забяспечана ланцугом або стальной лінкай. На такі воз-прычэпу дапускаецца браць груз не больш чым 1,5 тоны, а хуткасць язды не большая, чым 15 кіламетраў у гадзіну. (ак)

ТАДЖЫКСКАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА

Да 14 кастрычніка 1924 г. — аўтаномная рэспубліка. Затым пераўтворана 16 кастрычніка 1929 года ў Таджыкскую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку. У склад Саюза ССР яна ўвайшла 5 снежня 1929 г. Тэрыторыя — 143,1 тыс. кв. км (дзевяць дзесятых тэрыторыі рэспублікі займаюць горы). Насельніцтва — 3 мільёны 96 тысяч чалавек. Сталіца — горад Душанбэ (400 тысяч жыхароў).

Таджыкская ССР — адна з найбольш высакагорных рэспублік СССР. У яе паўднёва-ўсходняй частцы знаходзяцца горы Паміра з самым высокім пунктам у СССР — пікам Камунізму (вышыня 7495 м). Цэнтральную частку рэспублікі займаюць Туркестанскі, Зераўшанскі, Гісарскі і Алайскі горныя хрыбты, у паўночнай частцы знаходзіцца частка Ферганскай даліны. Сярод значнай колькасці рэк і рэчак сваёй велічынёй выдзяляюцца: Сырдар'я, Зераўшан і Амудар'я. Рэкі і рэчкі Таджыкскай ССР багаты гідраэнергіяй, на рацэ Вахш будуецца адна з самых вялікіх у СССР гідраэлектрастанцый — Нурэкская ГЭС магутнасцю ў 2,7 мільёна кілават. Клімат кантынентальны, лета сухое і доўгае, зіма кароткая і мяккая.

Нетры Таджыкскай ССР багаты рознымі карыснымі выкапнямі: вугалем, рознымі рудамі, у тым ліку цынку, свінцу, вальфраму, ртуці, волава, вісмуту і іншымі, а таксама нафтай, прыродным газам, каменнай соллю, будаўнічымі матэрыяламі. У Паміры і Цэнтральным Таджыкістане знаходзіцца значная колькасць мінеральных крыніц, якія выкарыстоўваюцца для лячэння розных захворванняў.

З занядбанай, адсталай правінцыі былой царскай Расіі Таджыкістан ператварыўся за гады Савецкай улады ў індустрыяльную краіну. Больш ста галін прамысловасці рэспублікі былі створаны пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Сярод іх вядучае месца займае энергетыка, лёгкая і спажывецкая прамысловасць. Развіваюцца таксама здабыча вугалю, нафты, розных рудаў, абагачэнне рудаў, металаапрацоўка, машынабудаванне, электратэхніка, вытворчасць будаўнічых матэрыялаў.

Асноўныя галіны сельскай гаспадаркі — гэта: вырошчванне бавоўны (асабліва каштоўных тонкарунных гатункаў), шаўкаводства, садаводства, вырошчванне вінаграду, абрыкосаў і нават лімонаў, а таксама вырошчванне розных збожжавых культур. Жывёлагадоўля Таджыкістана — гэта перш за ўсё развядзенне каракулевых авечак.

Таджыкістан славіцца вялікімі дасягненнямі ў развіцці навукі, асветы і культуры. Працуе Акадэмія навук Таджыкскай ССР, дзесяткі навукова-даследчых інстытутаў, 8 вышэйшых навучальных устаноў, 37 сярэдніх спецыяльных школ, 3084 агульнаадукацыйныя школы ўсіх відаў. У рэспубліцы дзейнічае 10 прафесіянальных тэатраў, кінастудыя, тэлевізійная студыя, радыё, выходзіць 106 газет, часопісаў і іншых перыядычных выданняў. (мг)

ВЯЛІКІ КОНКУРС



Куток практычных ведаў



КАЛІ ЛАМАЮЦЦА ПАЗНОГЦІ

Часта сярод вясковых людзей можна пачуць такое: «Якая там з яе гаспадыня, гляньце толькі на яе пазногці — дагледжаныя, быццам у вялікай пані!» Няма думкі больш памылковай і шкоднай, бо „добрая гаспадыня павінна быць добрай ва ўсім: і ў гаспадарчасці, і ў рабоце, і ў знешнім выглядзе, і важна пры гэтым не толькі добрая прычоска, ці прыгожая вопратка, але і модныя чыстыя туфелькі, прыгожыя рукі. Дык чаму ж добрая гаспадыня мела б мець брыдкія пазногці, калі яны з натуры здаровыя і правільна дагледжаныя?

Многія жанчыны аднак наракаюць, што маюць вельмі слабыя пазногці, якія без канца ламаюцца, а нават і расшчапляюцца. Асабліва пры цяжэйшай працы. Што рабіць тады?

Можна паспрабаваць штодзень на працягу некалькіх тыдняў мачыць пазногці перад сном у цёплым алеі, да якога неабходна дадаць некалькі кропель лімоннага соку. Мачыць пазногці трэба мінут 10—15. Падагрэты алей трэба ўліць у невялічкую глыбокую місачку, якую трэба паставіць у большы посуд з гарачай вадой, каб тэмпература была амаль увесь час аднолькавай.

Памачыўшы пазногці ў алеі, місачку накрыць і паставіць у чыстым месцы. Гэты алей можна ўжываць на працягу некалькіх дзён. Калі ж ён стане мутным, трэба яго выліць, а місачку дакладна памыць і напоўніць новай порцыяй алею і свежым сокам з лімона.

У драгерыях можна таксама купіць гатовы алей для пазногцяў пад назвай «Рэгевіт». Гэтым алеем трэба было б змазваць пазногці некалькі разоў на працягу дня, а ўжо абавязкова перад сном. Зразумела, не кожны мае такія магчымасці, каб займацца гэтай справай некалькі разоў у дзень, так што можа лепш мачыць пазногці раз у дзень у алеі з лімонным сокам.

Неабходна аднак памятаць, што як мачэнне пазногцяў у алеі з лімонным сокам, так і змазванне іх пры дапамозе «Рэгевіту» павінна адбывацца сістэматычна на працягу некалькіх тыдняў. Нельга спадзявацца нейкіх выразных вынікаў раней. Калі ж аднак праз некалькі тыдняў вы не заўважыце значнага паляпшэння стану вашых пазногцяў, неабходна будзе звярнуцца за парадай да доктара-дэрматолага (скурных хвароб).

Варта яшчэ звярнуць увагу на тое, што жанчыны, маючы слабыя пазногці, мусяць абмежаваць ужыванне хімічных парашкоў пры мыцці бялізны, альбо мець для гэтага спецыяльныя гумовыя рукавіцы.

Сяброўка



Суздаль

Звычайная кастрычніцкая нядзеля. Сёння ўстаем раней, чымсці кожны дзень. Нас чакае ўжо аўтобус, якім адправімся на экскурсію, ва Уладзімір і Суздаль.

І вось наш аўтобус на шырокай і простай вуліцы Масквы.

— Гэта вуліца называецца Шасе энтузіястаў, — інфармуе праз мікрафон Аляксей, прадстаўнік Саюза журналістаў.

Аляксея паклікаў вадзіцель аўтобуса. Штосьці яму нашаптаў. Той, выслухаўшы, зноў узяў у рукі мікрафон: «Таварыш вадзіцель інфармуе нас, што названне гэтай вуліцы ад таго, што ў даўніх часах была гэта дарога, якой адпраўлялі ў Сібір ссыльных. Гэтай дарогай ішлі ў Сібір дзекабрысты, сацыялісты і іншыя, каму ў нейкай меры не падабаўся царскі лад. Іх людзі часта называлі энтузіястамі, а адсюль і названне дарогі».

Пад'язджаючы да Суздаля ад Уладзіміра, мы бачым велізарную панараму горада. Цэрквы, вежы, званіцы з шатровымі заканчэннямі белымі плямамі выдзяляюцца на фоне не зусім яшчэ абсыпаўшайся зелені, зліваючыся ў адно цэлае з акружаючым краявідам.

Здалёк горад выглядае вялікім. Аднак гэта толькі ілюзія, якую ствараюць 70 помнікаў, што ляжаць усяго на двух з паловінай квадратных кіламетрах. Падарожнік з XIX стагоддзя пісаў пра Суздаль: «Когда колокольный звон всех церквей наполнял окрестности, то создавалось впечатление города не меньше Москвы».

Пры ўездзе ў горад вітаюць нас каменныя стаўбы «городской заставы», пабудаваныя яшчэ пры Екацярыне II, якая зацвердзіла ў 1788 годзе праект граніцы горада. Ад таго часу Суздаль як бы памёр, далей заставы не разбудоўваўся.

Да гэтага часу горад поўнасцю захаваў архітэктурны воблік са сваімі помнікамі старадаўнасці, якія разам ствараюць непаўторны ансамбль. Тут ёсць некалькі манастыроў, вялікая колькасць цэркваў і іншых памятнікаў. Суздаль мае свой Крэмль, які з'яўляецца самай старадаўняй часткай горада. Сярод высокіх вязаў знаходзіцца Прэабражэнская царква — помнік рускім цеслярам, якія змаглі пабудаваць з дрэва такі унікальны будынак.

З Пакроўскім дзевічым манастыром звязана гісторыя князя Васіля III і баярышні Саламаніі. Як вядома, на працягу 21 года шлюбнага жыцця яны не мелі дзяцей. Вялікі князь і княгіня давалі ахвяры на манастыры, пакланяліся святыням, вызвалялі злачынцаў, варажылі і ўсё гэта не дапамагло. Тады была паклікана Сцепаніда Разанка, вядомая ў той час варажыха ў Русі, якая сказала «что детям не быть». Тады князь вырашыў развесціся. Саламанія была пастрыжана і пад імем Сафіі адаслана ў манастыр, спачатку Маскоўскі Раждзесцвенскі, а потым у Суздаль. Вялікі князь ажаніўся другі раз з маладой княгіняй Галенай Глінскай. Праз тры гады ў іх нарадзіўся сын Іаан, якога потым назвалі Іванам IV Грозным. «Великий князь ликовал, — піша гісторык Татмакоў, — не подозревая Оболенского (любоўніка княгіні — дап. А. К.) сообщником брачному делу». Нямецкі падарожнік пісаў, што вялікі князь Васіль III, пражыўшы дваццаць адзін год з жонкай Саламаніяй Сабуравай і не дачакаўшыся дзяцей, пад прымусам пастрыг яе ў манахі, а неўзабаве пасля гэтага па Маскве разышліся слухі, што ў Саламаніі, сасланай у Пакроўскі манастыр у горадзе Суздалі, нарадзіўся сын Георгі».

Грабніца Георгія знаходзілася пад Пакроўскім манастыром да 1934 года пад відам грабніцы Анастасіі Шуйскай. Аднак археолагі ў тым жа годзе раскрылі грабніцу і сцвердзілі тут дзіцячую адзежу.

Каб зберагчы помнікі гісторыі і культуры, а таксама развіць турызм, Савет Міністраў СССР у жніўні 1967 года прыняў пастанову «Аб утварэнні турыстычнага цэнтра ў горадзе Суздалі». Зараз заканчваецца тут пабудова велізарнай гасцініцы на 2 тыс. месц. Апрача таго, рэстаўрыруюцца жылыя драўляныя домікі манашак на жылыя дамы для турыстаў. Адбываецца рэстаўрацыя помнікаў культуры. А калі глядзіш на горад са званіцы Рызпаложанскага манастыра, дык бачыш старынны горад, старажытнасці якога не парушае ніякі фабрычны комін, ні чыгунка; сучаснае будаўніцтва знаходзіцца за старым горадам.

А. Карпюк



Тым часам Мартынаў хутка крочыў па лесе. Ён адчуваў, як пад падэшвамі ботаў крышацца сухія галінкі, чуў, як у галлі дрэў сваволіць вецер, з захапленнем і хваляваннем пазіраў на птушак і кветкі і, калі выйшаў з лесу і яго позірку адкрылася шырокая, крыху хвалістая раўніна, што стракацела летнімі краскамі, а ў процілеглым баку была акаймавана белымі стваламі тонкіх бяроз, ён ледзь стрымаў крык радасці. Сеў на ўзлеску, паклаў побач з сабой аўтамат. Радасць ад усведамлення таго, што ён, нарэшце, зноў апынуўся на радзіме пасля трох гадоў пакут і зневажанняў, ахапіла яго з такой сілай, што ён нават не мог падняцца на ногі, каб ісці далей. Ён пазіраў на кратовыя грудкі, на пні, на крапіву, на вузкую стужку ручая і падумаў: «Усё гэта — Радзіма...». Вось сядзіць ён, старшы лейтэнант Сяргей Мартынаў, дваццаці трох год, родам з Тулы, кадравы афіцэр Чырвонай Арміі... Усімі сваімі пачуццямі ён убіраў у сябе Радзіму, але ведаў, што каб зноў стаць яе дастойным сынам, яму яшчэ многае трэба зрабіць. «Я быў ва Уласава, — думаў ён, — а гэта цяжкая віна. За яе расплата — смерць. Але цяпер я зраблю ўсё, каб заслужыць права на жыццё».

Мартынаў узяў аўтамат і падняўся з зямлі. Цяпер, калі ён ішоў па пярэстаму ад кветак луту, потым праз лес і зноў па адкрытым полю, да пачуцця радасці прымяшалася трывога. Ён вырашыў як мага хутчэй расказаць усё першаму ж савецкаму афіцэру, — як ён трапіў у палон у першыя ж дні вайны, як пакутаваў у канцэнтрацыйным лагеры, як яны галадалі. Раскажа пра жудасную зіму, што забрала жыццё з сабой больш паловы яго таварышаў, пра збраёвы завод у Польшчы, пра няўдалую спробу ўцёкаў, пра работу ў падпольным лагерным камітэце і партыйнай арганізацыі. Потым яго зваліла з ног хвароба, якую ён перамог толькі дзякуючы дапамозе таварышаў. Але ён усё роўна памёр бы ад недаядання, і, калі ў лагер прыйшлі ўласаўскія вярбоўшчыкі, таварышы рашылі, што ён павінен пайсці да Уласава, каб не памерці і каб ва ўласаўскай бандзе было некалькі нашых людзей. Рашэнне гэта прынялі дзевяць таварышаў, і цяпер Мартынаў спадзяваўся, што некаторыя з іх, магчыма, вярнуліся на Радзіму і пацвердзяць, што ўсё было іменна так тым студзеньскім днём 1944 года ў канцлагеры ля Данцыгскага заліва.

Мартынаў не знайшоў ніякай вёскі, ні дарогі. Ён натыкаўся на акопы, нямецкую зброю, стальныя шлёмы, дыскі з патронамі, на нізкія, наспех збудаваныя, цяпер ужо разбураныя дзоты. Зброя пакрылася ржой, дыскі пазеленелі ад цвілі — ляжалі там не адзін, відаць, тыдзень. Усё сведчыла аб тым, што фронт стаяў тут нядоўга. Танкі вырылі ў глебе глыбокія каляіны, але там, дзе пры паваротах гусеніцы зрэзалі толькі верхні пласт зямлі, зноў ужо вырасла трава.

Каля поўдня, агінаючы ўзлесак, Мартынаў раптам здаля ўбачыў надворныя пабудовы і тры хаты — адна была без даху, ад другой засталіся толькі апаленыя бярвенні і бэлькі і толькі з коміна трэцяй, зусім цэлай хаты, ішоў дым. Каля хаты стаяла дзяўчына і карміла карову. Мартынаў кінуўся бегчы праз чортапалох, па крапіве і толькі ля самай акаліцы гэтай разбуранай вёскі прымусіў сябе сцішыць крок. «Як ты растлумачыш людзям, — сказаў ён сабе, — чаму гэтак бяжыш?»

На дарозе яму сустрэўся стары селянін, у якога ён запытаў, ці ёсць паблізу ваенныя і як іх знайсці.

— Ваенныя? — перапытаў стары. — Шэсць ужо тыдняў няма тут ніякіх ваенных. Вайна адсюль пайшла, што ж тут ваенным рабіць?

— Змагацца з фашыстамі, што ў лясах.

Стары здзіўлена глянуў на Мартынава:

— Глупства. Няма тут ніякіх фашыстаў. Вунь там яны аднойчы цэлы дзень стралялі, а потым перабраліся цераз рэчку і пайшлі на захад. Дзе ж тут быць фашыстам?

— Каля Чырвонага яны хаваюцца яшчэ ў лясах.

— Лухта! — упіраўся стары. — Чырвонае! На мінулым тыдні я сам там быў, пайшоў пазычыць насенне. Навокал там усё спакойна.

— Чырвонае ж у гэтым баку?

— Не, вунь у тым, — паправіў Мартынава стары. — Зойдзем у хату. Час ужо палуднаваць, а ты ж пэўна прагаладаўся.

Яны ўвайшлі ў хату. Адна сцяна была зрашэчана кулямётнай чаргой, але наогул хата была цэлая. Мартынаў павітаўся з гаспадыняй і з нясмелай хударлявай дзяўчынкай гадоў дзесяцідванаццаці. Сеў на ляжанку і абвёў позіркам драўляныя талеркі, што стаялі на паліцы, шырокі стол і крэслы з рознымі спінкамі. Яму зрабілася прыемна ад думкі, што ён, нарэшце, упершыню за многа год зноў апынуўся ў так знаёмай яму і блізкай сэрцу сялянскай хаце і на роднай сваёй мове размаўляе з савецкім чалавекам. Аднак словы старога пра тое, што ў навакольных лясах няма фашыстаў, не давалі яму спакою. Яму хацелася распытаць старога больш падрабязна, але той не даваў яму і слова ўставіць — усё расказваў і расказваў пра фашысцкую акупацыю, пра партызанскую барацьбу, пра вяртанне Чырвонай Арміі.

— Амаль усе нашы мужыкі былі ў партызанах, — паведаміў ён. — Бельсіна — сапраўдная партызанская вёска.

«Бельсіна! — здзівіўся Мартынаў. —

ТРЫБУНА чытачоў

ПРАВІЛЬНА

У Юшкавым Грудзе Беластоцкага павету была ліквідавана грамадская рада. Частка яе адышла ў Шымкі, а частка — у Міхалова. Разабраўшыся, тут сапраўды, нехта зрабіў правільна. Міхалова — гэта самы цэнтр. Там гміна, ГС, СОП, пункты скупкі, млын, ветэрынарны пункт, крамы, міліцыя і многа ўсяго, як у мястэчку. Паехаўшы ў гміну, можна пры нагодзе ўсё аформіць.

У Юшкавым Грудзе, у тым будынку, дзе была грамадская рада, будзе пункт аховы здароўя. Тут будзе дэнтыстычны кабінет, аптэчны пункт, тут будуць таксама даваць лекарскія парады.

Кузьма з Вяндзюгі

ФІНАЛ

Мюнхен
цэнтральны стадыён
Свісток
пачынаюць іграць
Падае
страляюць па варотах
Гол
адзін другі і трэці
2:1
паляк' выйгрываюць
Свісток
канец ігры
Залатыя алімпійцы
Палякі.

Сцёпа Палаўянюк, Бельск



ЧАМУ...?

Чаму?
Не кожны
Шчасце мае.
Чаму?
Не кожны
Гора знае.
Чаму?
Не кожны
Рады сном.
Чаму?
Не кожны
Рады днём.
Чаму?
Не роўна
Сонца грэе.
Чаму?
Не роўна
Дажджом сее.
Чаму?
Не роўна
Свішча вецер.
Чаму?
Так дзеецца
На свеце.

Валя Анішчук, Гайнаўка

ПЕРАМАГЛІ ЛІЦЭІСТЫ З МІХАЛОВА

11 студзеня г.г. у будынку Малочнага тэхнікума ў Беластоку адбыліся паўфінальныя ігры чэмпіяната акругі па валейболу сярод каманд хлопцаў сярэдніх школ. У гэтым спаборніцтве сустрэліся каманды Механічнага тэхнікума ў Лапах і агульнаадукацыйных ліцэяў у Бельску і Міхалове. Змагаліся вельмі заўзята. Перамаглі ліцэісты з Міхалова.

Мікола Краўчук



Дарагое «Сэрцайка»!

Мне амаль 18 год. Я вучуся ў сярэдняй школе ў Б. Некалькі месяцаў назад я была на курсах у прыгожай мясцовасці, дзе пазнаёмілася з Толікам. Малады, прыгожы, прыстойны хлапец. Прыгожа таксама танцуе, а пераканалася я ў гэтым на танцавальнай вечарыне. Толік часта наведваў мяне, прыходзіў у гатэль, дзе я жыла. Але прыйшоў час расстання. Развіталіся мы вельмі сардэчна. Ён мяне прытуляў і цалаваў. Засталася назаўсёды ў маёй памяці яго вясёлая, прыемная ўсмешка. Перажываю я вельмі і не магу яго забыць. Часамі яго бачу ў горадзе. Хацела б з ім пагаварыць, але не маю адвагі. Хаваюся, стараюся, каб мяне не ўбачыў. Саромеюся. Парай мне, дарагое «Сэрцайка», што рабіць. Ці падыйсці, калі ўбачу яго на вуліцы? Але ці тактоўна гэта? Ці проста напісаць да яго пару слоў, што аб ім думаю? За параду буду вельмі ўдзячна.

Крыся з Г.
Бельскі павет

Пісаць да яго не раю. Толік першы павінен гэта зрабіць. Калі ты знаеш яго адрас, дык ён бадай твой таксама ведае. Але навошта гэта?! Ты ж часта бачыш Толіка ў горадзе. На курсах вы былі ўвесь час разам, дык хавацца і саромецца няма чаго. Наадварот, калі яго ўбачыш, дык старайся ісці такой дарогай, каб з ім сустрэцца, але каб ён нічога не прыкмеціў. Калі яму на табе залежыць, ён першы цябе зачэпіць, але калі пройдзе міма, нібы не заўважыўшы цябе, ты таксама яго не чапай. Сілай сэрцу міл не будзеш!

Дык жадаю табе мілага спаткання!

«Сэрцайка»

ПАТРЭБНАЯ СВЯТЛІЦА

У Тапчыкалах няма дзе правесці сход ці наогул свабодны час. Члены ЗМВ і КГВ усе свае мерапрыемствы праводзяць у прыватных кватэрах. Ёсць тут нават грамадскі тэлевізар, які стаіць у Пятра Сікоры, які ва ўласнай хаце выконвае ролю светліцовага.

Святліца тут патрэбная. У гуртку КГВ гавораць, што гміна магла б купіць у Беластоку будынак, прызначаны на ліквідацыю, які б яшчэ быў прыдатны на вясковую святліцу. Думка талковая.

Наглядальнік

§ Кансультацыя юрыста

ПЫТАННЕ: Ці можна патрабаваць уневажнення асведчання, зложанага ва ўстанове цывільнага стану, на аснове якога было прызнана бацькоўства мужчыне, які не з'яўляецца мужам маткі дзіцяці, калі асведчанне гэта было вымушана маткай дзіцяці?

АДКАЗ: Кожны мужчына, які адчувае сябе бацькам дзіцяці незамужняй дзяўчыны, можа злажыць перад кіраўніком бюро цывільнага стану асведчанне аб прызнанні бацькоўства. Прызнанне гэта важна, калі матка дзіцяці на гэта згаджаецца.

На працягу аднаго года мужчына, які злажыў гэтае асведчанне, можа патрабаваць перад судом ўневажнення прызнання, калі злажыў асведчанне пад уплывам бяспраўнай пагрозы і ў абставінах, калі той, хто злажыў асведчанне, мог баяцца, што яму самому, або іншай асобе пагражае сур'ёзная небяспека асабістая або маёмасная.

За гэтую пагрозу не можна прызнаць, напрыклад, тое, калі матка дзіцяці пагражае, што ў выпадку, калі мужчына не дасць асведчання аб прызнанні бацькоўства, яна падасць на яго ў суд наконт прызнання бацькоўства і аліментаў. Гэта не з'яўляецца пагрозай бяспраўнай, бо жанчыне гэткае права прыслугоўвае. Не з'яўляецца гэткай пагрозай і тое, калі жанчына, патрабуючы асведчання, страшыць, што ў выпадку адмовы яна паведаміць яго начальству або жонцы, бо калі яна скарыстае з свайго права — патрабавання ўстанаўлення бацькоўства праз суд, то гэтыя асобы і так даведаюцца аб бацькоўстве мужчыны.

«ПРЫМАКІ» Ў МАЛОЧКАХ

7 студзеня 1973 года ў вёсцы Малочкі Бельскага павету гурток БГКТ паставіў п'есу Я. Купалы «Прымакі». Ігралі: Я. Максімюк, В. Барташук, Л. Тэрлецкая, З. Барташук, Г. Барташук, А. Абрамчук, К. Хмур і Я. Хмур.

Пасля п'есы польскія і беларускія песні спявалі сёстры Л. і О. Тэрлецкія.

Гурток БГКТ у Малочках вельмі ўдзячны Бельскаму беларускаму ліцэю і дырэктару пачатковай школы ў Малочках М. Асеніку за дапамогу ў падрыхтоўцы «Прымакоў».

Я. з М.



Гандлёвыя павільёны ў Саколцы.
Фота Я. Цялушэцкага.

Няслаўная хроніка

■ 16.I.73 г. на дарозе Гайнаўка—Кляшчэлі паблізу вёскі Істок спалохаўся ад самахода конь Пятра Саўчука з Чаромхі. У выніку гэтага, гаспадар каня, якога ён вёў, упаў на дарогу і зламаў нагу.

■ 18.I.73 г. на дарозе Камёнка Старая—Вярхлессе ў Сакольскім павеце трактар з прычэпаю, які вёў Антон Рэха, з'ехаў з дарогі і вывернуўся ў роў. Міхал Дмітрук, які ехаў на прычэпе, зламаў нагу.

■ 22.I.73 г. у Ліпінах Гайнаўскага павету згарэлі дзве стадолы, два вазы, два электрычныя маторы, два матацыклы, чатыры авечкі і іншая маёмасць Пятра Башуна (30 год) і Пятра Шведа (35 год).



Нестар Перавой, Бельск. Другога варыянту перакладу байкі Крылова, на жаль, таксама не выкарыстаем. Адносна ж эпізоду «У цуды не веру, а цуд стаўся», дык мы, здаецца, ужо калісьці яго друкавалі ў вашых успамінах. Ён сапраўды цікавы, і мы яго захаваем у сваім архіве.

Значыць, гэта Бельсіна! Чырвонае на поўнач адсюль... Выходзіць, мы апынуліся амаль на дваццаць кіламетраў на захад ад месца сустрэчы».

Яны паелі крупніку з хлебам. Цяпер ужо гаварыла жонка старога — ёй хацелася неяк апраўдацца перад госцем за бедны пачастунак. У вёсцы, сказала яна, нічога не засталося, акрамя мізэрных запасаў, якія былі схаваны ў лясах. Цяпер у іх ёсць карова і крыху курэй. Амаль усю жыўнасць фашысты ўгналі за сабой. Яны б і вёску ўсю спалілі, каб у іх часу хапіла.

Мартынаў яшчэ раз запытаў, ці ведае стары, у якой з бліжэйшых вёсак размешчана якая-небудзь вайсковая часць, але той сказаў, што нічога не ведае. Мартынаў падзякаваў яму, развітаўся і пайшоў з вёскі па той жа дарозе, што і прыйшоў. Крочыў паволі. Думкі блыталіся ў галаве. Ён намагаўся ўспомніць кожнае слова старога селяніна, прыгадаць кожную перамену ў выразе яго твару. Не, сумненняў няма: пра фашыстаў стары нічога не ведае — твар яго быў шчыры і спакойны. А раз так, значыць, ніхто ні ў Бельсіна, ні ў Чырвоным таксама не ведае пра групу Грэльхамера. У гэтым раёне няма ніводнага савецкага салдата, але сяляне адчуваюць сябе ў поўнай бяспецы. Ідучы сюды, Мартынаў меркаваў, што ў кожным населеным пункце размешчаны часці Чырвонай Арміі — абараняюць вёскі, а ў лясы высылаюць баявыя групы; што фашысты нападаюць на населеныя пункты, атакуюць камунікацыі; што тут лютуе маленькая вайна з усёй рашучасцю, упартасцю і хітрасцю, на якія здольны абодва бакі.

У тым месцы, дзе танкі разварушылі зямлю, Мартынаў сеў на свежую мяккую траву. У галаве ўсё больш і больш разрасталася думка, якую ён увесь час адганяў, але чым больш ён думаў пра тое, што расказаў яму стары, тым мацней яна апаноўвала яго. Былі тры магчымасці. Першая: група Грэльхамера даўно ўжо знішчана савецкімі войскамі, але тады нельга зразумець, чаму ніхто з сялян нічога пра гэта не ведае. Другая магчымасць заключалася ў тым, што немцы пайшлі адсюль, а трэцяя — што яны так добра схаваліся ў лясах, што ніхто нават іх не высачыў. Апошняе здалося Мартынаву самым праўдападобным, і менавіта таму ў ім наспявала рашэнне, якое вабіла яго і пужала.

«А што калі мне вярнуцца да фашыстаў? — разважаў ён. — Я буду з імі, аж пакуль не даведаюся, дзе хаваецца Грэльхамер».

Ужо вечарэла, калі Мартынаў дабраўся да таго лесу, дзе ён пакінуў Альтэнкірха з Будэрам. Здавалася, яны зусім не сумняваліся, што ён вернецца да іх, і з радасцю выслухалі яго паведамленне. Альтэнкірх схіліўся над картай. Вось Чырвонае, а вось Бельсіна, а тут лес, у якім яны хаваюцца. Значыць, обер-лейтэнант Вайтхазе будзе чакаць іх вунь у тым пункце — за дваццаць кіламетраў адсюль.

— Цудоўна, — пахваліў Мартынава Альтэнкірх. — Ты, Іван, выдатна справіўся з заданнем. Цяпер паеш і паспі. Калі зойдзе сонца, мы рушым у дарогу.

(Працяг будзе)

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Кляшчэлі
„Ostatni watażka" (bułg.) 13—14. „Małżeństwo roku II" (rumuński), 15—16. „Ballada o Cable u Hogue'u" (USA), 17—18.

Нараўка
„Gangsterzy i filantropi" (polski), „Ostatnia gra Karima" (radz.), 14—18.

Нарва
„Agent Nr 1" (polski), „Jaskółki" (węgierski), 14—18.

Чыжы
„Pamiętnik szalonej gospodyni' (USA), „Bitwa o Kozi Dwór" (polski), 14—18.

Дубічы Царкоўныя
„Seksolatki" (polski), „Sami na wyspie" (jugosł.), 14—18.

Арэшкава
„Uciec jak najbliżej" (polski), „Krzyżacy" (polski). 17—18.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Боцькі
„Wujaszek Wania" (radz.), „Wojenka wojenka" (rumuński), 14—18.

Орля
„Gangsterzy i filantropi" (polski), „Ostatnia gra Karima" (radz.), 14—18.

Райск
„Kupujemy wóz strażacki" (NRD), „Testament Agi" (węgierski), 14—18.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Крынкі
„Jutro na orbitę" (radz.) 13—14. „Znicz olimpijski" (polski), 15—16. „Niech bestia zdycha" (franc.), 17—18.

Шудзялава
„Przez pustynię" (hiszpański), „Kto śpiewa nie grzeszy" (jugosł.), 14—18.

Янаў
„Szczęście Anny" (radz.), 14—18.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Nie smuć się" (radz.), 13—14. „Doczekać zmroku" (USA), 15—16. „Trzej świadkowie" (czeski), 17—18.

Мельнік
„Zwiadowca" (radz.), 13—14. „Gniewna podróż" (bułg.), 15—16. „Zaproszona" (franc.), 17—18.

Мілейчыцы
„Dziewczyna z walizką" (włoski), 13—14. „Kajtek i nowy braciszek" (węgierski), 15—16. „Początek nowego świata" (radz.), 17—18.

ДУБРОЎСКІ ПАВЕТ

Сухаволя
„Ballada o Cable u Hogue'u" (USA) „Małżeństwo roku II" (rum.) 14—18.

Новы Двор
„Gangsterzy i filantropi" (polski), „Pamiętnik szalonej gospodyni" (USA), 14—18.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego

Adres redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1, Telefony: red. naczelny 2-10-33, centrala 2-32-41 do 45. Warunki prenumeraty: miesięcznie — 2,40 zł, kwartalnie — 7,20 zł, półrocznie — 14,40 zł, rocznie — 28,80 zł. Prenumeratę przyjmują wszystkie placówki pocztowe i listonosze. Wpłaty na prenumeratę indywidualną należy dokonywać na konto PUPiK „Ruch" Nr 102-7-161 NBP Białystok I Oddział Miejski. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Zamówienia ze zleceniem wysyłki za granicę przyjmuje — Przedsiębiorstwo Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych „Ruch" Warszawa, ul. Wronia 23. Nr konta PKO 1-6-100024. Zamówienia z krajów europejskich jak i zamorskich należy kierować pod adresem Przedsiębiorstwo Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych „Ruch", Warszawa, ul. Wronia 23.

BZGraf. Nakład 7.592 K-1

З таджыкскага гумару

„Тыповы феадал"

Пасля снедания Рахатой падыйшла да свайго мужа і, солядка пацягваючыся, сказала:

— Ты ведаеш, мне ўчарашні балет зусім не спадабаўся. Адно сумоцішча — толькі танцуюць, танцуюць, танцуюць. І маўчаць, як глуханямыя... Хадзем зараз у кіно!

— Зранку ў кіно? — здзівіўся муж. — Як жа з работай?

— Ат, работа... Ты пазвані, скажы, захварэў.

— Сорамна, любая! У кіно можна і ўвечары схадзіць.

— Увечары? Дык мы ж павінны ехаць на вяселле! Не, ты немагчымы чалавек, ты тыповы гэты... як там звалі тых, што да рэвалюцыі мучылі жанчын? Ага, успомніла: ты — тыповы феадал! Балазе, што ногі ў мяне, хвала алаху, яшчэ ходзяць — сама пайду!

Увечары, калі муж вярнуўся з работы, яна сказала:

— Карціна мне, мілы, не спадабалася. Давай лепш у звярынец сходзім. Там, кажуць, прывезлі нейкіх малпачак, якія нібыта... гавораць. Хоць пацешымся.

— Любая, звярынец увечары ўжо не працуе, малпачак, якія гавораць, не існуе, і, да таго ж, мы павінны ехаць на вяселле да стрыечнай сястры.

— Што? На вяселле? Да гэтай фіфы? Ніколі! Хадзем лепш на канцэрт. Увесь горад у захапленні. Што? Не, мілы, ты самы тыповы феадал.

— Пойдзем заўтра, любая, у оперу, — сказаў муж на другі дзень. — У нас уся школа ўдзельнічае ў культпаходзе.

— Культпаход? А-а-а, ты болей клапоцішся пра калектыў, чым пра здароўе і шчасце жонкі! Няшчасная я — звязала свой лёс з такім феадалам! Давядзецца самой шукаць разгарнення... і буду! Буду!

— Ну, добра, тады я адзін пайду разам з нашымі настаўнікамі слухаць «Кармен».

Калі пачалася опера, да яго нахіліўся завуч і незадаволеным тонам прагаварыў:

— Заўтра я мушу аб вашых паводзінах паставіць пытанне на педсавеце. Падумаць толькі — нават у оперу вы прыйшлі без жонкі. Усе ж бачаць, што гэта тыповае праяўленне феадальна-байскіх адносін да жанчын!

Бахадур Файзулоеў

— *Ах, дарагі, нашаму б цаху такі графік!*

НІЎКА

З цырку тут адзін будзе жыць, гавораць, што ён і па столі ходзіць.

Талаваломка

Злучыце паміж сабою па адным разе ўсе чорныя кружочкі так, каб у «павуціне нітак» можна было адшукаць 6 геаметрычных фігур. Якіх? (Паўкруг таксама ўяўляе частку адной фігуры).

Адказ на заданне з папярэдняга нумара:

ДАМА

Дама, якая прытрымліваецца высокай думкі аб сваім голасе, пазнаёмілася з дырыжорам і прадэманстравала яму сваё майстэрства.

— Мне многія гаварылі, што з такім голасам я магу пайсці ў оперу. А вы як думаеце?

— Зразумела. Калі вы купіце білет...

СУСЕД

Сусед дзеда Пракопа, не аддаўшы яму доўгу, адважыўся папрасіць яго пазычыць яшчэ раз. Стары яго выслухаў і загадаў узяць са скрыні патрэбныя грошы.

— Але тут няма ніякіх грошай! — абурыўся сусед, адчыніўшы пустую скрынку.

— Адкуль ім узяцца, калі ты іх яшчэ не аддаў, — спакойна адказаў яму дзед Пракоп.

КОЖНАМУ ПА ЗАСЛУГАХ

— Ну, як жывеш, Хрысцінка? Як муж?

— Ведаеш, даражэнькая, я такая шчаслівая — муж мяне на руках носіць.

— А ў мяне якраз наадварот: я п'янага мужа на руках нашу... з вуліцы ў кватэру...

НАВІНА

— У выніку нядаўна праведзенага даследавання ўстаноўлена, што пяцьдзесят працэнтаў з ліку асоб, якія ў апошні час узялі шлюб, — мужчыны.

...Ён трымаў вуха востра, рукі па швах, язык за зубамі, нос на ветры, камень за пазухай і... дулю ў кішэні.

...Ён, узяўшы ініцыятыву ў свае рукі, не ведаў, што з ёю рабіць.

Без слоў.

А ПРОСТА

На вуліцы сустрэліся дзве жанчыны:

— Зусім не разумею, — кажа адна, — чаму муж і жонка Дранкевічы, якія не могуць цярпець адзін аднаго, нарэшце не развядуцца?

— Усё вельмі проста, — тлумачыць другая. — Іх нянавісць дайшла да таго, што ні муж, ні жонка не хочуць разводам зрабіць узаемнай прыемнасці.

МІНІБАЙКІ

ДАКЛАДНЫ АНАЛІЗ

У адным горадзе прыкметна знізіўся продаж лязо для брытваў, пэндзлікаў і ўтварыліся звышнарматыўныя запасы мыльнай пены. Гандлёвыя работнікі захваляваліся: у чым справа? Рашылі прыцягнуць на дапамогу вылічальна-аналітычную машыну. Калі ў яе заклалі ўсе патрэбныя дадзеныя, машына адразу выдала адказ: «Новая мода дакацілася аж да нашага горада. Маладыя казлы пачалі адпускаць бароды».

М. Сямёнаў

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Тамары Сац з Гайнаўкі змяшчаем папулярную ваенную песню

SERCE W PLECAKU

Z młodej piersi się wyrwało,
w wielkim bólu i rozterce,
i za wojskiem poleciało
zakochane czyjeś serce.

Tę piosenkę, tę jedyną
śpiewam dla ciebie, dziewczyno,
może także jest w rozterce
zakochane czyjeś serce.
Może potajemnie kochasz
i po nocach tęsknisz, szlochasz.
Tę piosenkę, tę jedyną
śpiewam dla ciebie, dziewczyno.

Żołnierz drogą maszerował,
nad serduszkiem się użalił,
więc je do plecaka schował
i pomaszerował dalej.

Tę piosenkę...

Poszedł żołnierz na wojenkę,
poprzez góry, lasy, pola,
i ze śmiercią szedł pod rękę,
taka już żołnierska dola.

Tę piosenkę...

I choć go trafiły wielce
kule, gdy szedł do ataku,
żołnierz śmiał się, bo w plecaku
miał w zapasie drugie serce.

Tę piosenkę...

ЧАГО Ў СПОРЦЕ НЕ БЫВАЕ!

— *Відаць, пара канчаць трэніроўку.*

МІНІВЕРШЫ

АЦАНІЛІ

На кожным сходзе слова ён прасіў
І эрудыцыяй фарсіў,
Хоць кожны бачыў: добры гэта птах,
Ён толькі лапатаць з трыбуны быў мастак.

П. Сушко

ПЕНЬ

Хоць называюць Пнём гнілым,
А я стаю на зло ўсім.
Дарогу мне усе ўступаюць,
Хоць і клянуць, ды аб'язджаюць.

І. Данчанка

Курёзы

ГЭТЫЯ БЕЛЫЯ МЯДЗВЕДЗІ...

Канадскі горад Чэрчыл, размешчаны на беразе Гудзонава заліва, называюць «сусветнай сталіцай белых мядзведзяў». У яго наваколлі пастаянна жывуць каля трохсот белых волатаў. Прыхільнасць мядзведзяў да раёна Чэрчыла тлумачыцца проста. Горад быў пабудаваны на самым скрыжаванні іх міграцыйных шляхоў.

Гаспадары тундры ўжо даўно прыносяць нямала клопатаў жыхарам Чэрчыла і гарадскім уладам. А цяпер, пасля таго, як паляванне на белых мядзведзяў было забаронена, яны становяцца ўсё больш нахабнымі. У мінулым годзе ў горадзе давялося правесці сапраўдную аблаву. 24 белыя разбойнікі былі схоплены проста на вуліцах або ў дварах. «Парушальнікаў спакою» пагрузілі ў самалёты і адвезлі далёка на ўзбярэжжа, за многія сотні кіламетраў ад горада. Аднак грошы, сабраныя канадскімі аматарамі жывёльнага свету на «авіябілеты», фактычна прапалі. «Некалькі «ссыльных» мядзведзяў, зрабіўшы 500-кіламетравы пераход па тундры, вярнуліся ў Чэрчыл і пасяліліся зноў на гарадской звалцы, якую даўно ўжо выкарыстоўваюць і як сталоўку, і як інтэрнат.

Нядаўна белыя драпежнікі адважыліся на самы сапраўдны крадзеж з узломам. Яны папалі на пластмасавы басейн, у якім мірна жылі тры невялікія палярныя кіты, адлоўленыя для амерыканскага заапарка ў Сан-Дыега. Аднаго кіта мядзведзі забілі, другога — вагой у паўтоны, цяжка паранійўшы, выцягнулі з басейна з тым, каб, магчыма, даставіць у сваю «сталоўку». Падаспеўшай паліцыі давялося пусціць у ход агнястрэльную зброю, і адзін з разбойнікаў быў забіты...

Між нямі

Ад кантакту са звярамі людзі становяцца больш чалавечымі.